Наколькі прыстасавана наша асяроддзе да людзей, якія не бачаць фарбы навакольнага свету, не могуць загадзя абысці фізічную перашкоду на сваім шляху? СТАР 3

Размова ў «палітычным клубе «Звязды» прысвечана супярэчнасцям і перспектывам інтэграцыйных працэсаў у Еўропе і на постсавецкай прасторы. СТАР 5

Абрад «Калядныя цары», што праходзіць у вёсцы Семежава Капыльскага раёна, — адзіны ў Беларусі, што ўваходзіць у Спіс нематэрыяльнай спадчыны ЮНЕСКА. Ён прыцягвае ўвагу і беларусаў, і замежных гасцей. СТАР 6

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 СТУДЗЕНЯ 2013 г. АЎТОРАК № 7 (27372) Кошт 1300 рублёў

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

«У БЕЛАРУСІ НЕ ПАВІННЫ БЫЦЬ ЗНІЖАНЫ ТЭМПЫ МАДЭРНІЗАЦЫІ»

Такую задачу паставіў 14 студзеня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, прымаючы з дакладам прэм'ер-міністра Міхаіла Мясніковіча, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.

Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў далажыць аб тых фактарах, на якія ўрад у гэтым годзе мае намер звярнуць асаблівую ўвагу.

«На фоне пэўных поспехаў у эканоміцы, аб чым і вы ўжо ў канцы года гаварылі, і міністры нашы адзначаюць, але гэта відаць, існуе, вядома ж, і шэраг негатыўных фактараў, якія не могуць не насцярожваць, але па якіх мы павінны вельмі сур'ёзна працаваць. Было б дзіўна, калі б гэта не адбывалася на фоне ўзрастаючага крызісу сусветнай эканомікі, прынамсі ў Еўрасаюзе, паколькі ўсё ж наша супрацоўніцтва, як і з Расійскай Федэрацыяй, парытэтна вельмі высокае», — адзначыў Прэзідэнт.

Галоўным пытаннем сустрэчы стаў ход падрыхтоўкі да маштабнай мадэрнізацыі вытворчага сектара.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на нізкі тэмп прыросту ВУП, аднак падкрэсліў, што яго больш непакоіць не гэты фактар: у Беларусі не павінны быць зніжаны тэмпы мадэрнізацыі і намечаныя крокі па якасным паляпшэнні эканомікі і вырабляемых тавараў. Кіраўнік дзяржавы запатрабаваў далажыць аб тым, як урад будзе працаваць у гэтым напрамку сёлета, а таксама пацікавіўся тым, як вырашаюцца ўрадам праблемы, якія сёння хвалююць людзей.

Як адзначыў Міхаіл Мясніковіч, у цэлым эканоміка развіваецца даволі стабільна.

Што датычыцца мадэрнізацыі прадпрыемстваў, то Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што тут не павінна быць кампанейшчыны. Але разам з тым неабходна дайсці да кожнага прадпрыемства.

У той жа час дзяржава гатова падтрымліваць працэсы мадэрнізацыі і інавацыйнага развіцця і на прадпрыемствах недзяржаўнага сектара або з невысокай доляй дзяржаўнай уласнасці.

Як адзначыў прэм'ер-міністр, кожнае прадпрыемства, кожны выканкам, кожнае міністэрства павінны займацца пытаннямі мадэрнізацыі прадметна, і гэта павінна даваць высокі вынік. «Патраціць грошы і не атрымаць новую прадукцыю — гэта злачынства», — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч.

НА АГЕНЬЧЫК І ШЧУПАК ІДЗЕ

Зімовая рыбалка на Святым возеры ў Рагачоўскім раёне.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, прэм'ер-міністр:

«Аптымізацыя ў дзяржорганах Беларусі закране 13 тыс. дзяржслужачых. Па разліках Міністэрства фінансаў, гадавая эканомія па фондзе аплаты працы, выкліканая скарачэннем дзяржапарату, складзе Br1 трлн у бягучых цэнах. Разам з тым, беларуская сістэма дзяржкіравання не грувасткая і не дарагая, асабліва ў параўнанні з іншымі краінамі. У супастаўных з нашай краінай па насельніцтве і тэрыторыі дзяржавах, такіх як Аўстрыя, Славакія, Балгарыя, колькасць цэнтральных апаратаў міністэрстваў без уліку супрацоўнікаў сілавых ведамстваў і агульная колькасць чыноўнікаў у 1,5-2 разы вышэй, чым у Беларусі».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	– 1°
Віцебск	– 7°
Гомель	– 2°
Гродна	– 3°
Магілёў	– 5°
Мінск	– 4°

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.01.2013 г.

Долар ЗША	8660,00
Еўра	11490,00
Рас. руб.	286,00
Укр. грыўня	1066,17

■ Мінскай вобласці — 75 гадоў

Барыс БАТУРА:

МІНШЧЫНА МАЕ ПАТЭНЦЫЯЛ ДЛЯ ВЫРАШЭННЯ САМЫХ СКЛАДАНЫХ ЗАДАЧ

Мінскай вобласці сёння спаўняецца 75 гадоў. Гэта значная вяха ў гісторыі і рэгіёна, і ўсёй краіны. Уклад Мінскай вобласці ў агульнарэспубліканскія паказчыкі значны: валавы ўнутраны прадукт — 14,6 працэнта (2-е месца), прадукцыя сельскай гаспадаркі — 24,4 працэнта (1-е месца), інвестыцыі ў асноўны капітал — 19,4 працэнта (2-е месца), экспарт тавараў — 16 працэнтаў (2-е месца), рознічны тавараабарот — 13,8 працэнта (2-е месца), прадукцыя прамысловасці — 14,3 працэнта (4-е месца). Пры гэтым патэнцыял рэгіёна да канца не выкарыстаны: ёсць рэзервы для таго, каб выйсці ў безумоўныя лідары па многіх пазіцыях. Аб гэтым — у размове карэспандэнта БЕЛТА са старшынёй Мінаблвыканкама Барысам Батурам.

Фота БЕЛТА.

СТАР 2

БЯСПЛАТНЫЯ САЦЫЯЛЬНЫЯ ПАСЛУГІ: НОВЫЯ НОРМЫ І НАРМАТЫВЫ

З 1 студзеня гэтага года ўступіў у сілу пералік бясплатных і агульнадаступных сацыяльных паслуг, якія аказваюцца дзяржаўнымі ўстановамі сацыяльнага абслугоўвання (дамамі-інтэрнатамі, тэрытарыяльнымі цэнтрамі сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва), а таксама нормы і нарматывы, па якіх грамадзяне будуць забяспечвацца гэтымі паслугамі.

Пералік зацверджаны пастановай Савета Міністраў ад 27 снежня 2012 года № 1218 «Аб некаторых пытаннях аказання сацыяльных паслуг». Яго прыняцце накіравана на павышэнне даступнасці і якасці сацыяльнага абслугоўвання.

Пералік сацыяльных паслуг, якія аказваюцца, вельмі шырокі і ахоплівае сацыяльна-бытавыя (13 відаў з падвідамі), сацыяльна-медыцынскія (15), сацыяльна-педагагічныя (4), сацыяльна-пасрэдніцкія (13), сацыяльна-рэабілітацыйныя (7), кансультацыйна-інфармацыйныя (2) і іншыя паслугі.

Напрыклад, рацыянальнае харчаванне, у тым ліку дыетычнае, па прызначэнні доктара ў доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў павінна прадастаўляцца 4 разы ў дзень, у доме-інтэрнаце для дзяцей-інвалідаў — 5 разоў у дзень. Мыццё галавы для асоб, якія пражываюць у доме-інтэрнаце, будзе ажыццяўляцца 2 разы на тыдзень (для тых, хто знаходзіцца на пасцельным рэжыме з поўнай стратай здольнасці да самаабслугоўвання, — не радзей чым 1 раз у тыдзень). Стрыжка прадугледжана адзін раз у месяц, галенне барады і вусоў — 2 разы на тыдзень. Прафілактычны агляд урачом павінен праводзіцца 1 раз у квартал, комплексны паглыблены медагляд і дыягнастычнае абследаванне — раз у год (калі няма медыцынскіх паказанняў). Чытанне ўслых часопісаў, газет, кніг — 2 разы на тыдзень і г.д. Калі чалавек захоча атрымліваць нейкую паслугу часцей, то яна будзе платнай.

❍ ❍ ❍

Новы від сацыяльных паслуг, які будзе аказвацца дамамі-інтэрнатамі для сем'яў з дзецьмі-інвалідамі, паслугі сацыяльнай перадышкі. У гэтым выпадку гаворка ідзе пра вызваленне бацькоў, іншых членаў сям'і ад догляду дзіцяці-інваліда ў мэтах прадастаўлення ім магчымасці аднаўлення сіл, вырашэння сямейна-бытавых пытанняў. Паводле вышэйзгаданага пераліку сацыяльных паслуг, сацыяльная перадышка можа быць устаноўлена на перыяд да 28 сутак у год.

Сістэма дзяржаўных устаноў сацыяльнага абслугоўвання рэспублікі ўключае ў сябе 77 дамоў-інтэрнатаў (45 псіханеўралагічных, 22 — для састарэлых і інвалідаў, 10 — для дзяцей-інвалідаў), 3 спецыяльныя дамы для састарэлых і інвалідаў, 149 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва (ТЦСАН), 2 цэнтры сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей. Акрамя таго, паслугі прадастаўляюцца сацыяльна-педагагічнымі цэнтрамі і цэнтрамі карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі (якія функцыянуюць у сістэме Мінадукацыі). СТАР 2

■ Рынак працы

А размеркаванне — усё роўна на рабочыя прафесіі

Па звестках Белстата, за 7 апошніх гадоў колькасць прафесійна-тэхнічных навучальных устаноў скарацілася ў Беларусі на 15 адзінак, а колькасць навучэнцаў у іх — на 34,7 тысячы чалавек, або на 30%. На пачатак гэтага навучальнага года адукацыю ў прафесійна-тэхнічных навучальных установах атрымлівала каля 80 тысяч чалавек.

За той жа перыяд сетка ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі павялічылася ў краіне на 21. У гэтым навучальным годзе адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі рэалізуюць 225 навучальных устаноў, а агульная колькасць навучэнцаў у іх перавышае 152 тысячы чалавек.

У 2012 годзе больш як 94% ад агульнай колькасці навучэнцаў, залічаных у прафесійна-тэхнічныя ўстановы адукацыі, былі прынятыя па заяўках і дагаворах, заключаных з арганізацыямі — заказчыкамі кадраў. З улікам патрэб галін эканомікі і сацыяльнай сферы ў 2012 годзе прафтэхустановамі былі падрыхтаваны і выпушчаны на рынак працы больш як 50 тысяч кваліфікаваных рабочых і служачых. Дзве і больш кваліфікацыі атрымалі 77,7% выпускнікоў.

Цікава, што ў 69 установах прафтэхадукацыі зараз ажыццяўляецца падрыхтоўка кадраў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, і, як пацвярджаюць водгукі работадаўцаў, выпускнікі такіх прафтэхкаледжаў запатрабаваны на вытворчасці. Размова ідзе пра практыка-арыентаваных спецыялістаў, якія маюць або высокі працоўны разрад або некалькі рабочых прафесій і на іх аснове — кваліфікацыю спецыяліста. У Міністэрстве адукацыі ўпэўнены, што такая падрыхтоўка ў значна большай ступені адпавядае патрэбам рынку працы.

У сваю чаргу, у 15 установах сярэдняй спецыяльнай адукацыі ажыццяўляецца падрыхтоўка рабочых з прафесійна-тэхнічнай адукацыяй. Пры недахопе рабочых кадраў, у тым ліку высокай кваліфікацыі, гэта надзвычай актуальны накірунак падрыхтоўкі. Тым больш што колькасць выпускнікоў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, якія працаўладкоўваюцца менавіта па рабочых прафесіях, складае сёння па краіне больш як 35%, а ва ўстановах, падпарадкаваных Міністэрству адукацыі, — больш за 50%.

Надзея НІКАЛАЕВА

МОЦНЫ МОКРЫ СНЕГ І НАВАТ ДОЖДЖ

У аўторак атмасферныя франты з боку паўднёвага захаду Еўропы істотна пагоршаць надвор'е ў нашай краіне, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

У сераду амаль ва ўсіх раёнах будзе ісці мокры снег, а на паўднёвым усходзе краіны магчымы нават дождж. Месцамі чакаецца моцны мокры снег, туман, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. У ноч на сераду прагназуецца мароз ад 0 да мінус 7, а на поўначы — да мінус 10 градусаў. Удзень будзе ад 5 марозу на поўначы да 3 цяпла на поўдні Беларусі.

Будзе ісці снег і мокры снег і ў чацвер. Месцамі чакаецца мяцеліца і моцны снег. На дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак ад 0 па паўднёвым усходзе да мінус 10 па паўночным захадзе краіны.

У пятніцу да нас завітае чарговая хваля холаду. Мяркуецца, што ў выхадныя тэмпература паветра на працягу сутак будзе ўжо мінус 11—18 градусаў, уначы пры праясненнях — да 24 марозу; толькі на паўднёвым усходзе — 6—10 градусаў ніжэй за нуль.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

РАСІЙСКАЯ АРМІЯ АДМАЎЛЯЕЦЦА АД АНУЧ

Расійская армія да канца гэтага года адмовіцца ад ануч як элемента формы вайскоўцаў. Аб гэтым заявіў міністр абароны Расіі Сяргей Шайгу падчас селектарнай нарады. «Да канца 2013 года мы павінны забыць слова «анучы», — сказаў Сяргей Шайгу. — Лічу важным вылучыць на гэта дадатковыя сродкі. У першую чаргу забяспечыць тых, хто служыць у Сібіры і на Далёкім Усходзе. Неабходна цалкам адмовіцца ад гэтага паняцця ва ўзброеных сілах «. Боты і анучы будуць цалкам заменены чаравікамі з высокімі берцамі і шкарпэткамі, якія ўжо знаходзяцца ў пераліку рэчавага забеспячэння вайскоўцаў.

РЭФЕРЭНДУМ ПА ЧЛЕНСТВЕ ВЯЛІКАБРЫТАНІІ Ў ЕС БУДЗЕ ПРЫЗНАЧАНЫ НА 2018 ГОД

Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Дэвід Кэмеран выступіць 22 студзеня ў Гаазе з прамовай аб сваім бачанні будучыні Еўропы і абвесціць аб правядзенні ў Брытаніі ў 2018 годзе рэферэндуму па пытанні членства краіны ў Еўрасаюзе. У апошні час Дэвід Кэмеран узмацніў крытыку палітыкі і цяперашняга стану Еўрасаюза, дамагаючыся вяртання Брытаніі большай колькасці паўнамоцтваў, якія былі перададзены Бруселю. Лондан таксама блакіраваў праект шматгадовага бюджэту саюза, лічачы, што ён не выгадны Вялікабрытаніі. Некалькі тыдняў таму брытанскі прэм'ер заявіў, што гатовы будзе правесці рэферэндум, на якім брытанцы павінны вырашыць, ці застанецца краіна ў складзе Еўрасаюза. Аднак крыніцы газеты Mail on Sunday сцвярджаюць, што пазіцыя прэм'ера па Еўропе памякчэла, і выхад з саюза ён лічыць вар'яцтвам. Не верыць ён і ў поспех рэферэндуму, аднак выкарыстоўвае яго як перамоўную тактыку ў дыялогу з Бруселем, каб дамагчыся пашырэння паўнамоцтваў Лондана. Відавочна, уплыў на яго аказваюць і заявы міжнародных палітыкаў, сярод якіх прадстаўнікі Еўракамісіі, якія ўжо выказалі асцярогі адносна наступстваў такога кроку. Прэзідэнт ЗША Барак Абама таксама даў зразумець, што Штаты не падтрымаюць спробу Брытаніі выйсці са складу саюза.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ІМІГРАНТЫ ПАВЯЛІЧЫЛІ НАСЕЛЬНІЦТВА ГЕРМАНІІ ДА 82 млн ЧАЛАВЕК

Насельніцтва Германіі да канца 2012 года ўзрасло да 82 мільёнаў чалавек, піша Die Welt са спасылкай на Федэральную службу статыстыкі. У пачатку года ў краіне было зарэгістравана 81,8 мільёна чалавек.

Павелічэнне колькасці жыхароў удалося дасягнуць толькі дзякуючы імігрантам, якія прыехалі ў ФРГ у 2012 годзе. Між тым, смяротнасць у краіне ўсё яшчэ перавышае нараджальнасць. За мінулы год у Германіі нарадзілася ад 660 да 680 тысяч дзяцей (на 860-880 тысяч смерцяў). Такім чынам, дэфіцыт нараджальнасці склаў 185-200 тысяч дзяцей, што адпавядае лічбам за 2011 год.

Пры гэтым колькасць імігрантаў за мінулы год выраслa ў параўнанні з папярэднім. Калі за 2011 год у Германію пераехала каля 279 тыс. чалавек, то ў 2012 годзе гэты паказчык павялічыўся да 340 тысяч.

КОРАТКА

Гарады Оршу і Полацк аб'яднаюць з іх раёнамі. Адпаведны ўказ падпісаў 14 студзеня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Аб'яднанне прадугледжана ў мэтах удасканалення сістэмы дзяржаўнага кіравання, забеспячэння комплекснага развіцця адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак базавага тэрытарыяльнага ўзроўню.

Беларусь учора выплаціла $99 млн доўгу Міжнароднаму валютнаму фонду. Плацяжы па знешнім доўгу ў 2013 годзе складуць $3,1 млрд. На працягу 2013 года неабходна пагасіць доўг перад МВФ (з улікам працэнтаў) у суме $1,63 млрд.

Беларуска-венесуэльскае сумеснае прадпрыемства «Петралера БелаВенесалана» ў 2012 годзе здабыло ў Венесуэле 1,1 млн тон нафты і 790 млн куб.м газу. Непасрэдна з беларускіх нетраў у 2012 годзе было здабыта 1,66 млн тон нафты і 213 млн куб.м газу.

Рэалізацыя закона аб амністыі завершана ў Беларусі. Усяго пад дзеянне закона падпалі 18 737 асуджаных. Вызвалены з папраўчых устаноў закрытага тыпу 3 059 чалавек, з папраўчых устаноў адкрытага тыпу — 1 167 чалавек. Адмоўлена ў прымяненні амністыі 6 198 асуджаным у папраўчых установах закрытага тыпу і 1 356 асуджаным у папраўчых установах адкрытага тыпу.

ЯКІ СІМВАЛ МОГ БЫ СТАЦЬ АСНОВАЙ ДЛЯ РАСПРАЦОЎКІ БРЭНДА ВІЦЕБСКА?

Віктар НІКАЛАЙКІН, старшыня Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта:

Думаю, калі гаварыць аб брэндзе Віцебска, напэўна, брэнд, па-першае, гэта сам Віцебск з яго больш як тысячагадовай гісторыяй. І ўсё, што засталося з гісторыі, трэба захоўваць — у прыватнасці помнікі архітэктуры. Стараемся вярнуць Віцебску былы выгляд. Вось аднавілі з нуля Свята-Успенскі сабор і іншыя аб'екты дойлідства. Віцебск вядомы сваім унікальным рэльефам — з узвышшамі і нізінамі горада, вядомы рэкамі (Лучоса, Віцьба, Заходняя Дзвіна).

Па-другое, напэўна, брэнд — нашы землякі Шагал, Пэн, а таксама Малевіч, які працаваў у Віцебску, Рэпін, дача якога захавалася, знакамітая мастацкая школа. Нідзе такога няма. Сёння ўжо ва ўсім свеце добра ведаюць, што Шагал нарадзіўся ў Віцебску, і горад гэта беларускі, а раней жа многія лічылі што Шагал — французскі мастак. І едуць у Віцебск, каб убачыць горад, які натхняў Майстра. З мільёны долараў у год зарабляем на паслугах турызму. У вышэйпералічаным бачу брэнд. А проста так і стварыць брэнд, напэўна, не атрымаецца.

Цімафей ФІРСАЎ, менеджар:

Здабытак Віцебшчыны — гэта лён. Яго кветкі намаляваны на гербе нашай краіны. Віцебск можа і павінен стаць сусветнай сталіцай лёну. Буцікі па ўсім горадзе, у якіх прадаюцца самыя модныя вырабы з віцебскага лёну самых вядомых брэндаў (Армані, Ніна Рычы, Х'юга Бос і г.д.). Па ўсім горадзе праходзяць модныя паказы, віцебскія прыгажуні дэманструюць ільняныя рэчы. А ў бюджэт горада адлічваюцца добрыя падаткі, за грошы ад якіх лён увекавечваюць у бронзе... Па-мойму, усё гэта было б нядрэнна!

Ларыса КУЧЫНСКАЯ, сакратар міжгародняга вузла электрасувязі:

Ведаеце, складана адказаць так адразу. Можа, тое, што звязана з рэлігіяй, бо кажуць у мінулым вельмі шмат было ў нашым горадзе цэркваў, сабораў, сінагог... Я думаю, што людзям цікава было б даведацца пра гэта больш падрабязна. А наогул я вельмі люблю наш горад, і спыніцца на нейкім адным вельмі складана.

Вядома, неад'емная «частка» нашага горада — гэта міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» і яго слаўная гісторыя, якая налічвае вось ужо больш як дваццаць гадоў. Гэта таксама цікава. Ды і людзі ў Віцебску нарадзіліся, жылі і працавалі вельмі цікавыя і вядомыя на ўвесь свет.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

МІНШЧЫНА МАЕ ПАТЭНЦЫЯЛ ДЛЯ ВЫРАШЭННЯ САМЫХ СКЛАДАНЫХ ЗАДАЧ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Індыкатарам дынамікі эканамічнага развіцця, як вядома, з'яўляецца тэмп росту валавога рэгіянальнага прадукту (ВРП). Барыс Васільевіч, ці атрымалася Мінскай вобласці ў 2012 годзе дасягнуць прагнознага паказчыка па ВРП, і на якой вышыні ўстаноўлена планка на 2013-ы? Якія важнейшыя складальнікі рэгіянальнага росту ў бліжэйшай перспектыве?

— Мінская вобласць, і гэта я канстатую з задавальненнем, выканала прагнозны паказчык па ВРП у 2012 годзе (105,5 працэнта). Але мы не спыняемся на дасягнутым: на 2013 год тэмп росту ВРП павінен скласці 108 працэнтаў. Гэта складаная задача. Але, я ўпэўнены, выканальная.

Адзін з важных напрамкаў работы ў гэтым годзе — удасканаленне арганізацыі вытворчасці, павышэнне прадукцыйнасці працы за кошт аптымізацыі расходаў, рацыянальнага выкарыстання рэсурсаў. Прыярытэтнымі задачамі застаюцца нарошчванне экспарту, аптымізацыя імпарту, павелічэнне дадатнага сальда гандлёвага балансу. А значыць, будзе прадоўжана работа па асваенні новых рынкаў збыту, павелічэнні долі экспарту вырабленай з мясцовых відаў сыравіны прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю.

Дарэчы, нашу прадукцыю ведаюць у 161 краіне свету. За апошнія дзесяцігоддзе вытворчасць прамысловай прадукцыі ў Мінскай вобласці павялічылася ў 2,6 раза. У структуры прамысловай вытворчасці рэспублікі на долю Міншчыны прыпадае 100 працэнтаў калійных угнаенняў, 77,1 працэнта макаронных вырабаў, 54,1 працэнта цукру-пяску, 47,4 працэнта безалкагольных напіткаў, 45,6 працэнта трыкатажных вырабаў.

Немалаважная роля ў Мінскай вобласці адводзіцца малому і сярэдняму прадпрымальніцтву. Прыватны бізнэс дае істотную долю валавога рэгіянальнага прадукту, забяспечвае фарміраванне канкурэнтнага асяроддзя, садзейнічае скарачэнню беспрацоўя. Колькасць суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва з 2010 года выраслa на 14 працэнтаў (цяпер іх больш за 50 тыс.).

Інвестыцыі на развіццё эканомікі і сацыяльнай сферы вобласці за апошнія сем гадоў выраслі ў тры разы і за студзень—лістапад 2012 года дасягнулі Br25,3 трлн. Асноўныя аб'ёмы інвестыцый накіроўваліся ў прамысловасць, сельскую гаспадарку, транспарт, сувязь і будаўніцтва жылля.

— Мінская вобласць, безумоўна, прывабная для інвестараў: гэта і выгаднае геаграфічнае становішча ў цэнтры рэспублікі, на скрыжаванні транс'еўрапейскіх калідораў, і доступ да рынкаў Еўрасаюза, Расіі і Казахстана ў рамках адзінай мытнай прасторы, і развітая інфраструктура, і высокі кадравы патэнцыял.

— Так, гэта так. У Мінскай вобласці інвестарам, якія плануюць рэалізоўваць капіталаёмкія інавацыйныя праекты, якія даюць магчымасць ствараць высокапрадукцыйныя рабочыя месцы, гарантуецца падтрымка на ўсіх узроўнях кіравання.

На 1 студзеня 2013 года заключана і зарэгістравана ў Міністэрстве эканомікі 559 інвестыцыйных дагавораў на агульную суму больш за Br18,8 трлн.

Сярод найбольш значных для Мінскай вобласці інвестыцыйных праектаў — інвест-праект ЗТАА «Славкалій». І, безумоўна, будаўніцтва Кітайска-Беларускага індустрыяльнага парку ў Смалявіцкім раёне. Для нашай краіны праект выгадны не толькі з пункту гледжання павелічэння экспарту высокатэхналагічнай прадукцыі: у тэхнапарку будуць створаны сотні сучасных рабочых месцаў.

У гэтым годзе ў Фаніпалі прадоўжыцца будаўніцтва завода па вытворчасці чыгуначнага пасажырскага гарадскога і прыгараднага электратранспарту (у гэтым годзе плануецца ўвесці ў эксплуатацыю першы пускавы комплекс). У Барысаве наладжана вытворчасць па зборцы легкавых аўтамабіляў сумесна з кітайскай кампаніяй. У 2012 годзе ў Валожынскім раёне пачата рэалізацыя інвестпраекта па стварэнні аграпрадпрыемства па вытворчасці беконнай свініны. За кошт прамых замежных інвестыцый кампаніі з Нідэрландаў плануецца рэалізацыя праекта па вытворчасці лекавых прэпаратаў шляхам перапрацоўкі плазмы крыві.

Прывабнай для замежных інвестараў павінна стаць Нарачанская курортная зона.

— Агрэпрамысловы комплекс Мінскай вобласці, займаючы ў структуры сельскагаспадарчых зямель рэспублікі крыху больш за 21 працэнт, вырабляе чвэрць валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі ў агульнарэспубліканскім аб'ёме. На што робіцца стаўка ў АПК?

— Шлях да высокіх дасягненняў у АПК няпросты: ёсць праблемы, што назбіраліся гадамі, вырашаць якія даводзіцца адначасова з новымі задачамі, якія дыктуе час.

Падабраўшы прафесіянала на тую ці іншую пасаду, ім не трэба кіраваць, яму трэба толькі дапамагаць. Таму стаўку мы робім не на ўзрост кандыдата, а на яго кампетэнтнасць, адказнасць, здольнасць прымаць рашэнні і адказваць за іх.

У мінулым годзе сельскагаспадарчыя арганізацыі вобласці вырабілі 2 млн 300 тыс. тон збожжа. Упершыню ўраджайнасць збожжавых і зернебабовых культур дасягнула 38 ц/га (прыплюсавалі да 2011 года амаль 5 ц/га). А ў Нясвіжскім раёне ўраджайнасць дасягнула 64,5 ц/га, у Клецкім — 51 ц/га, Мінскім — 50 ц/га. У гэтым годзе плануем атрымаць ужо 2,5 млн тон збожжа.

У жывёлагадоўлі пераважна за кошт росту прадукцыйнасці за 2012 год на 9,3 працэнта павялічана гадоўля жывёлы і птушкі ў жывой вазе, сярэднясутачныя прырасты ў вазе буйной рагатай жывёлы на гадоўлі і адкорме дасягнулі 598 г, свіней — 510 г. У мінулым годзе прадукцыйнасць дойнага статка склала 5047 кг. Пастаўлена больш за 1,5 млн тон малака.

У параўнанні з 2005 годам у Мінскай вобласці вытворчасць валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі павялічылася ў 1,6 раза. На першы план выходзіць задача забеспячэння канкурэнтаздольнасці прадукцыі, павышэння эканамічнай эфектыўнасці яе вытворчасці і рэалізацыі. Гэта значыць прыбытак і самафінансаванне павінны стаць галоўнымі крытэрыямі перспектыўнага развіцця галіны.

АПК вобласці ідзе па шляху стварэння буйных інтэграцыйных структур — аграпрамысловых холдынгаў, у якіх перапрацоўчыя прадпрыемствы і сельгасарганізацыі будуць працаваць у цеснай кааперацыі. На Міншчыне ўжо ёсць структуры, дзе ўкаранёны поўны цыкл вытворчасці, перапрацоўкі і рэалізацыі, — агракамбінаты «Сноў» і «Дзяржынскі». У бліжэйшай перспектыве холдынгавыя групы будуць створаны ў кожным раёне вобласці.

Перспектыва развіцця АПК — у далейшай інтэграцыі вытворчасці, перапрацоўкі і лагістыкі. Гэта дасць магчымасць у 2013 годзе ў сельскагаспадарчых арганізацыях давесці выручку ад рэалізацыі прадукцыі на аднаго працуючага ў сярэднім па вобласці да Br237 млн.

— Вы неаднаразова падкрэслівалі, што галоўнай мэтай з'яўляецца павышэнне дабрабыту людзей, сацыяльная стабільнасць і ўпэўненасць у заўтрашнім дні.

— Гэта маё глыбокае перакананне. На фоне дасягненняў у эканамічнай сферы дзейнасці важнейшым вынікам з'яўляецца павышэнне ўзроўню жыцця насельніцтва.

За мінулую пяцігодку рэальная заработная плата ў Мінскай вобласці выраслa ў 1,6 раза, а за два гады бягучай пяцігодкі — у 1,2 раза. У снежні 2012 года намінальная заработная плата склала Br4 млн 350 тыс., што ў эквіваленце больш за $500.

— Жыллёвая праблема, як вядома, была і застаецца адной з самых актуальных. Як яна вырашаецца ў Мінскай вобласці?

— З 2006 года ў рэгіёне ўведзена больш за 7 млн кв.м жылля. Узровень жыллёвага будаўніцтва ў Мінскай вобласці застаецца адным з самых высокіх у рэспубліцы. Кожны пяты квадратны метр уведзенага жылля ў агульнарэспубліканскім аб'ёме — на рахунку Міншчыны.

За тры апошнія гады ў рэгіёне пабудавана больш за 3 млн кв.м жылля. Гэта дае магчымасць штогод вырашаць жыллёвую праблему больш як 10 тыс. сем'яў, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у Мінскай вобласці. У 2012 годзе, паводле папярэдніх даных, чакаецца ўвод агульнай плошчы жылых дамоў больш як 857 тыс. кв.м. А ў 2013 годзе трэба будзе пабудаваць 1 млн 400 тыс. кв.м, у тым ліку 500 тыс. кв.м для маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, што перавышае план 2012 года амаль у 2 разы.

— Цяпер шмат гавораць аб неабходнасці прыходу новай фармацыі кіраўнікоў, у тым ліку аб амаладжэнні кадравага складу. Якое ваша меркаванне, і па якім прынцыпе вы падбіраеце сваю каманду?

— Спачатку трэба вызначыцца з тым, што маецца на ўвазе пад азначэннем «маладыя кадры»: невялікі прафесійны і жыццёвы вопыт або паспяховасць і дзелавітасць, сучасныя веды і ініцыятыўнасць. Маё глыбокае перакананне, што, падабраўшы прафесіянала на тую ці іншую пасаду, ім не трэба кіраваць, яму трэба толькі дапамагаць. Таму стаўку мы робім не на ўзрост кандыдата, а на яго кампетэнтнасць, адказнасць, здольнасць прымаць рашэнні і адказваць за іх, наяўнасць лідарскіх якасцяў. Дарэчы, сам я стаў у 40 гадоў намеснікам міністра ЖКГ.

Што датычыцца маладых спецыялістаў, то ў апошнія гады ў Мінскай вобласці робіцца нямала для таго, каб дапамагчы ім у прафесійным станаўленні, вырашэнні жыллёва-бытавых праблем, уключэнні ў актыўнае грамадскае жыццё. Вядома, праблем нявырашаных тут яшчэ нямала. Возьмем хаця б такі факт: замацаванасць маладых спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у сярэднім па вобласці ў 2010—2012 гадах склала 80,6 працэнта (у іншых рэгіёнах рэспублікі гэта лічба яшчэ ніжэйшая). Такі стан спраў не можа задавольваць, бо без творчых, дзелавых, дасведчаных маладых спецыялістаў немагчыма развіццё сельгасгаліны, мадэрнізацыя арганізацый, укараненне новых тэхналогій.

Алена ПРУС, БЕЛТА.

Галоўнымі тэмамі ў СМІ павінны стаць мадэрнізацыя прадпрыемстваў і фарміраванне здаровага ладу жыцця, сказаў старшыня Мінскага аблвыканкама Барыс Батура ўчора на сустрэчы з галоўнымі рэдактарамі рэспубліканскіх і абласных сродкаў масавай інфармацыі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Адной з асноўных тэм для асвятлення ў СМІ павінна стаць мадэрнізацыя прадпрыемстваў і стварэнне новых вытворчасцяў. У Мінскай вобласці ў гэтым годзе будуць адкрыты не менш як 110 невялікіх прадпрыемстваў з высокай дабаўленай вартасцю на аднаго працоўнага, — сказаў Барыс Батура. Ён таксама адзначыў, што Мінаблвыканкам будзе і надалей займацца арганізацыяй умоў для вольнага часу насельніцтва, асабліва ў сельскай мясцовасці. І роля СМІ ў выхаванні моладзі з часам толькі ўзрастае, — рэзюмаваў ён.

БЯСПЛАТНЫЯ САЦЫЯЛЬНЫЯ ПАСЛУГІ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Яшчэ адна новая паслуга — суправаджальнае пражыванне інвалідаў, дзякуючы якому інваліды з дапамогай спецыялістаў змогуць набыць навыкі, што дазволяць ім пасля жыць самастойна па-за інтэрнатам, весці хатнюю гаспадарку і працаваць у адпаведнасці са сваімі магчымасцямі. Суправаджальнае пражыванне інвалідаў будзе аказвацца ў дамах-інтэрнатах і тэрытарыяльнымі цэнтрамі сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва (ТЦСАН). У дамах-інтэрнатах будуць створаны адпаведныя аддзяленні. Пражыванне ў такім аддзяленні інвалідаў I і II групы, дзяцей-інвалідаў, якія знаходзяцца на агульным рэжыме, будзе магчымае на перыяд не больш за 3 гады. Таксама рэгламентаваны паслугі суправаджальнага пражывання для інвалідаў I і II групы, якія захавалі поўную або частковую здольнасць да самаабслугоўвання і перамяшчэння і раней пражывалі ў дамах-інтэрнатах.

Што тычыцца тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, то яны будуць прадастаўляць паслугу памочніка па суправаджэнні інваліда I групы з абмежаванай здольнасцю да перамяшчэння (яе нарматыў — у дзённы час не больш за 20 гадзін у месяц у адпаведнасці з рэкамендацыямі медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіі або заключэннем урачэбна-кансультацыйнай камісіі). Сярод новых паслуг — і прадастаўленне асістэнта адзінокім і адзінока пражываючым інвалідам I групы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Асістэнт будзе прадастаўляцца ў дзённы час не больш за 30 гадзін у месяц таксама ў адпаведнасці з рэкамендацыямі МРЭК або заключэннем ВКК.

Суправаджэнне асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, пры неабходнасці будзе ажыццяўляцца да дасягнення імі ўзросту 23 гадоў.

❑❑❑

Атрымаць бясплатныя паслугі няні цяпер змогуць і сем'і, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў (у дзённы час па працоўных днях не больш за 4 гадзіны ў тыдзень). Сацыяльным стандартам таксама вызначана, што калі дзіця-інвалід расце ў няпоўнай сям'і, то няня для яго будзе бясплатна прадастаўляцца ў дзённы час па працоўных днях на тэрмін да 20 гадзін у тыдзень (пакуль такое дзіця не дасягне 4 гадоў).

Калі ў сям'і нарадзіліся двайняты, дапамога няні будзе прадастаўляцца на тэрмін да 12 гадзін у тыдзень да дасягнення дзецьмі ўзросту 3 гадоў. Пры нараджэнні трайнят і больш дзяцей гэты нарматыў павялічваецца да 40 гадзін у тыдзень.

Парадак і ўмовы аказання сацыяльных паслуг, а таксама формы дагавораў будуць зацверджаны Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны, парадак аказання сацыяльна-медыцынскіх паслуг — Міністэрствам аховы здароўя. Аказанне сацыяльна-педагагічных паслуг будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб адукацыі.

Святлана БУСЬКО.

ЗА ПАДМАН ОРГАНАЎ СТАТЫСТЫКІ СТРОГА КАРАЮЦЬ

У мінулым годзе супрацоўнікі Камітэта дзяржкантролю Віцебскай вобласці выявілі факты нясвоечасовай выплаты заработнай платы ў 26 суб'ектаў гаспадарання. У сумным спісе арганізацыі, прадпрыемствы і гаспадаркі Віцебска, Полацка, Наваполацка, Браслаўскага, Віцебскага, Глыбоцкага, Докшыцкага, Дубровенскага, Лёзненскага, Аршанскага, Полацкага, Пастаўскага, Расонскага, Сенненскага і Ушацкага раёнаў.

Таксама былі ўстаноўлены восем фактаў не прадастаўлення даных справаздачнасці аб пратэрмінаванай запазычанасці па зарплаце або прадастаўленне скажоных даных у органы дзяржаўнай статыстыкі (суб'ектамі Віцебска, Браслаўскага, Глыбоцкага, Докшыцкага, Лёзненскага, Сенненскага і Ушацкага раёнаў). Да адміністрацыйнай адказнасці за вышэйназваныя парушэнні прыцягнулі чатыры юрыдычныя асобы і 17 упаўнаважаных службовых асоб з накладаннем штрафаў на агульную суму 26,5 мільёна рублёў.

Адказныя асобы з адкрытага акцыянернага таварыства «Барсеева» Лёзненскага раёна, дзе была пратэрмінаваная запазычанасць па зарплаце за жнівень 2012-га ў суме 949 мільёнаў рублёў, прадаставілі ў органы дзяржаўнай статыстыкі звесткі аб адсутнасці запазычанасці. Варта адзначыць, што раней за прадастаўленне справаздачы са скажонымі данымі вінаватая службовая асоба таварыства ўжо прыцягвалася судом Лёзненскага раёна да адміністрацыйнай адказнасці — заплаціла штраф 2,2 мільёна рублёў. За паўторнае правапарушэнне галоўны бухгалтар сельскагаспадарчай арганізацыі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці з накладаннем штрафу на суму 10 мільёнаў рублёў.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

ДЗВЕ ЗОРКІ «АСІПОВІЧАЎ»

Гасцініца ў раённым цэнтры абнавілася і атрымала катэгорыю «дзве зоркі».

У будынку, які месціцца ў цэнтры горада, зрабілі рэканструкцыю і сучасны рамонт, набылі новую мэблю і, адпаведна, павысілі ўзровень абслугоўвання кліентаў. Асіповічы — буйны чыгуначны вузел, і мясцовая гасцініца прапануе пастаяльцам больш за 40 нумароў, у тым ліку і павышанай камфортнасці. Тут ёсць прамая тэлефонная сувязь, маленькіх дзяцей забяспечаць спецыяльным ложкам, кліентам бясплатна зробяць рамонт і хімічную чыстку адзення.

Толькі ў снежні ў гасцініцы спынілася каля 400 чалавек, прычым кожны дзясяты з іх — замежны госць. У гасцініцы тлумачаць, што ў іх жывуць спецыялісты, якія прыязджаюць на асіповіцкія прадпрыемствы, дзе ідзе будаўніцтва і мадэрнізацыя. Пашырылася і колькасць прыватных візітаў: у «Асіповічах» актыўна селяцца рускія і ўкраінцы.

Ілона ІВАНОВА.

НЕ СЯЧЫЦЕ ДРЭВЫ...

Гродзенскія арнітолагі рэкамендуюць менш высякаць ў лясах старыя дуплістыя дрэвы. Па іх меркаванні, гэта дапаможа захаваць папуляцыю ўдодаў і іншых птушак у нашай краіне.

Як растлумачыў кіраўнік Гродзенскага аддзялення аб'яднання «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Зміцер Вінчэўскі, удод нездарма названы птушкай 2013 года — гэта адна з самых прыгожых птушак у Беларусі. Але зараз папуляцыя скарачаецца, таму што птушкі сутыкаюцца з недахопам месцаў для гнездавання. Удоды селяцца ў дуплах старых дрэў, якія ў апошні час актыўна высякаюцца.

У 2013 годзе плануецца правесці ўлік гэтага віду птушак. Па традыцыі, сёлета з'явіцца манета з выявай удода, маркі і канверты, таксама пройдзе конкурс дзіцячых малюнкаў і казак пра гэтую птушку.

Сяргей ДРУЖЧЫЦ.

БЕРАЖЛІВАСЦЬ ЛІЧАЦЬ У РУБЛЯХ

Траціць эфектыўна, берагчы разумна. Камітэт дзяржаўнага кантролю Магілёўскай вобласці вучыць прадпрыемствы выгаднай справе — эканоміі энергіі.

Семінар «Сучасныя тэхналогіі энергазберажэння, іх укараненне і эканамічная эфектыўнасць» прайшоў на прадпрыемстве «Магілёўхімвалакно». Удзельнікі семінару азнаёміліся з аўтаматызаваній сістэмай кантролю і ўліку электрычнай энергіі, якая дае магчымасць эфектыўна ёй распараджацца і эканоміць. Эканомія таварыства «Магілёўхімвалакно», дзе сістэму ўкаранілі ў 2011 годзе, склала 14 мільярдаў рублёў. І такіх прадпрыемстваў у рэгіёне ўсё больш. Таму што памяншэнне энергавыдаткаў на вытворчасць і, як вынік, зніжэнне сабекошту прадукцыі даюць магчымасць больш упэўнена канкураваць на рынках збыту.

У семінары бралі ўдзел прадстаўнікі 170 прадпрыемстваў і арганізацый, банкаў і ўладных структур. На семінары прадставілі розныя інавацыйныя ўстройствы (напрыклад, свяцільні), якія дазволяць эканоміць энергію. Усё гэта вельмі актуальна ў Год беражлівасці.

Ілона ІВАНОВА.

«МАБІЛЬНЫ» ЗЛАДЗЮЖКА

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Першамайскага РУУС Мінска затрымалі падазронага ў крадзяжы 34 мабільных тэлефонаў.

— 18-гадовы непрацуючы мінчанін без спраў бадзяўся на вуліцы Філімонава, пакуль не зайшоў пагрэцца ў будынак аўтаваказала «Маскоўскі». Тут ён вырашаў застацца да раніцы, для чаго, каб не прыцягваць увагі да сваёй персоны, прыкархнуў у закутку за абменным пунктам, — распавяла падрабязнасці здарэння прэс-сакратар Першамайскага РУУС сталіцы Вольга Куцько. — Прачнуўшыся ў дзве гадзіны ночы, ён пайшоў прагуляцца і на другім паверсе звярнуў увагу на гандлёвы павільён аднаго з аператараў мабільнай сувязі. І на розум маладому чалавеку прыйшла думка пра крадзеж...

Каб рэалізаваць задуманае, зламыснік падцягнуўся да даху, адагнуў адзін з пластыкавых шчытоў і такім чынам патрапіў унутр. Узяўшы з паліцы пакеты, малады чалавек пачаў набіваць іх усім, што трапляла ў поле яго зроку: навушнікамі, мр3-плэерамі, мабільнымі тэлефонамі. Не пакінуў без «увагі» і касу. Агульная сума ўрону, як потым было падлічана, склала каля 29 мільёнаў рублёў. Больш за ўсё было ўкрадзена мабільных тэлефонаў — 34 адзінкі.

Рэалізоўваць украдзенае мінчанін пачаў ужо наступным днём. Мабільнікі, па заніжаных цэнах, прапаноўваў людзям тут жа на вуліцы. Атрыманыя грошы па большасці «спускаў» на гульнявыя аўтаматы. Міліцыянеры ўстанавілі асобу злачынцы і затрымалі яго па месцы жыхарства. Убачыўшы аператыўнікаў, зламыснік ва ўсім прызнаўся. Частку ўкрадзенага канфіскавалі. Падазроны знаходзіцца ў ізалятары часовага ўтрымання. Праводзіцца расследаванне.

Сяргей РАСОЛЬКА.

У ПОШУКАХ ЗАМЕЖНАГА ЛЕГІЁНА

Расіянін спрабаваў нелегальна перайсці беларуска-польскую мяжу, каб трапіць у французскі Замежны легіён. Брэсцкія памежнікі затрымалі парушальніка, калі ён пераадолеў сігналізацыйную сістэму.

23-гадовы хлопец з Архангельска тлумачыў пазней, што перабраў многа прафесій, але сябе не знайшоў. Вось і вырашыў паспрабаваць патрапіць у Замежны легіён. З сабой захапіў прадукты, нож, два расійскія замежныя пашпарты і некалькі геаграфічных карт. Цікава, што ў расійскай арміі кандыдат у легіён не служыў, бо мае праблемы са зрокам.

Яна СВЕТАВА.

У ОФІСЫ — ЯК «НА ПРАЦУ»?

Сталічныя праваахоўнікі вышукваюць мужчыну, які ўкраў ноўтбук з адміністрацыйнага будынка.

Як паведамілі ў Першамайскім РУУС г. Мінска, невядомы зайшоў у будынак і пачаў заглядваць у кабінеты. У адным з іх нікога не было, затое на стале ляжаў ноўтбук. Зламыснік схапіў яго і, схаваўшы пад куртку, паспяшаўся да выхаду. Якраз у гэты момант да кабінета падышла адна з супрацоўніц. Яна пацікавілася ў незнаёмца мэтай візіту. Той адказаў: маўляў, хацеў бы працаўладкавацца, але, відаць, заблукаў. Пасля гэтага хуценька паспяшаўся сысці. Калі жанчына выявіла знікненне ноўтбука, звярнулася ў міліцыю. Сума ўрону склала каля 4 мільёнаў рублёў. Дзякуючы таму, што злачынца патрапіў у поле зроку камеры відэаназірання, аператыўнікі ведаюць, як выглядае падазроны. Дарэчы, у міліцыянераў ёсць падставы меркаваць, што выкрадальнік ноўтбука можа мець дачыненне да іншых аналагічных злачынстваў, якія былі здзейснены з офісных памяшканняў і адміністрацыйных будынкаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.

КАНФІСКАВАЛІ 18,5 ТОНЫ БАНАНАЎ

Віцебскія мытнікі канфіскавалі буйную партыю бананаў, незаконна ўвезеных на тэрыторыю Беларусі, агульным коштам каля 170 мільёнаў рублёў.

У памежнай вёсцы Юхавічы Расонскага раёна быў затрыманы грузавы аўтамабіль «Рэно», у рэфрыжэратары якога перавозілі амаль 18,5 тоны бананаў. У якасці атрымальніка тавару ў дакументах быў пазначаны неіснуючы суб'ект гаспадарання полацкага рэгіёна. Перамяшчэнне бананаў па тэрыторыі нашай краіны ажыццяўлялася без фітасанітарнага сертыфіката.

Віцебскай мытняй распачаты адміністрацыйны працэс. Кошт трапічных фруктаў, якія незаконна перавозілі па тэрыторыі Мытнага саюза, толькі па папярэдняй ацэнцы склаў каля 170 мільёнаў рублёў. Бананы канфіскавалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

■ Спорт-тайм

ШТУЧНАЯ ПРАЎДА

Хакей — спорт мужных, тых, хто не шкадуе свайго здароўя, у любы момант можа кінуцца пад шайбу, заступіцца ў лядовай бойцы за таварыша. Так мяне вучылі, з такімі думкамі я жыў і буду жыць. Але часам не хакеісты вырашаюць лёсы турніраў, а тыя, хто, магчыма і на каньках ніколі не стаяў, але лічыцца начальнікам, а значыць, апошняе слова будзе за ім.

На выхадных у Данецку скончыўся Кантынентальны хакейны кубак. Сярод удзельнікаў — італьянскі «Бальцана», французскі «Руан», наш жлобінскі «Металург» і, безумоўна, гаспадар «Данбас», які гуляе ў Кантынентальнай хакейнай лізе. Гэты турнір — аналаг футбольных еўракубкаў. Толькі розніца ў тым, што гэтае першынство ўжо даўно не цікавіць хакейных волатаў з Швецыі, Фінляндыі, Расіі, Швейцарыі... А таму ўдзел «Данбаса», каманды, якая прэзентуе лепшы чэмпіянат Еўропы, стаў добрай дапамогай для арганізатараў з Міжнароднай федэрацыі хакея. Украінскі бок зразумець таксама можна. Клуб з Данецка толькі пачынае ствараць уласную гісторыю, а таму перамогі ў разнастайных турнірах ім для ўпэўненасці спатрэбяцца, зацікавяць новых балельшчыкаў, патэнцыяльных гледачоў. Але тое, што адбылося насамрэч здзіўляе і ставіць пад сумнеў аўтарытэт падобных спаборніцтваў.

Так склалася, што ў першы дзень турніру наш «Металург» сустракаўся менавіта з «Данбасам». Матч атрымаўся напружаным. Жлобінскай камандзе, якая амаль цалкам складаецца з беларускіх хлопцаў, супрацьдзейнічала інтэрнацыянальнае асарці з расіян, чэхаў, славакаў, фінаў, паўночнаамерыканцаў, украінцаў. Беларусы ў гэтым матчы слабакамі не былі: мужна супрацьстаялі апаненту і прапусцілі толькі аднойчы. Аднак самае цікавае вызначылася пасля. Аказваецца за «Данбас» гуляў канадзец Рэндзі Рабітайл, які не меў права ўдзельнічаць у паядынку. Справа ў тым, што яго імя ўваходзіла ў спіс у пашыранай заяве, тэрмін якой скончыўся яшчэ 28 снежня, але на той момант гэты хакеіст яшчэ не мог выступаць за ўкраінцаў. 30 снежня ён гуляў наогул за іншую каманду. Пасля матча беларусы падалі пратэст. Дырэктарат турніру разгледзеў заяву беларусаў, прызнаў, што канадзец не мае права ўдзельнічаць у матчах Кантынентальнага кубка, толькі перагледзець вынік сустрэчы адмовіўся.

— Я вельмі засмучаны тым, што парушылі правілы, а наш пратэст адхілілі, — прызнаўся ў Данецку Васіль Спірыдонаў, галоўны трэнер «Металурга». — Здзіўляецца адзін з карыстальнікаў інтэрнэт-форумаў газеты «Прессбол». — Так нас ніколі паважаць не будуць. Трэба было з'язджаць...». «Металург» не з'ехаў. Перамог у апошніх сустрэчах і заняў другое месца, гуляючы амаль на роўных з камандай КХЛ. Да іх пытанняў ніякіх. А вось да будучых беларускіх удзельнікаў Кантынентальнага кубка яны ёсць. Навошта ўдзельнічаць у тых спаборніцтвах, дзе рэгламент можна пераглядаць колькі заўгодна? Мы таксама павінны быць моцнымі.

Тарас ШЧЫРЫ.

МЕДАЛЬНЫ «ЎРАДЖАЙ» ДОМРАЧАВАЙ І ДАШЧЫНСКАГА

Мінулыя выхадныя выдаліся вельмі багатымі на спартыўныя падзеі. «Звязда» разглядае найбольш яркія моманты.

Этап Кубка свету па біятлоне ў Рупольдынгу адзначыўся «сярэбраным» дублем Дар'і Домрачавай. Лепшая біятланістка краіны двойчы ўздымалася на другую ступень п'едэстала — па выніках спрынту і масстарту. Здаецца, лідар жаночай зборнай зноў выйшла на свой узровень. Больш якаснай стала стральба. Калі на папярэднім этапе ў Аберхофе Дар'я запісала ў свой пасіў ажно 9 промахаў, то ў гэты раз па суме дзвюх гонак на штрафныя кругі прыйшлося зазірнуць толькі тры разы. Іншая справа, што з большай дакладнасцю «знікла» хуткастрэльнасць. На агнявых рубежах Домрачава зноў стала губляць шмат часу, якога вельмі не хапае на апошніх метрах дыстанцыі. Тым не менш добры ход па лыжні дазваляе лідару нашай каманды адыгрываць вялікія адставаніі ад бліжайшых саперніц. Так, у масстарце на апошні круг Дар'я адпраўлялася трэцяй, за 17 секунд пасля Вольгі Зайцавай. Але ўжо на наступнай адсечцы Домрачава апярэдзіла расійскую спартсменку на 4 секунды! Дарэчы, па хуткасці беларуска зараз саступае толькі рэактыўнай Мірыям Гёснер з Германіі.

Дзякуючы добраму выступленню ў Рупольдынгу Дар'я Домрачава перамясцілася на трэці радок у генеральнай класіфікацыі. І гэта не мяжа, як лічыць сама біятланістка: «У пачатку сезона ў мяне былі некаторыя праблемы з лыжамі і здароўем. Зараз я адчуваю, што знаходжуся ў добрай форме, хутка бягу і нядрэнна страляю. Так што ў другую частку сезона гляджу з аптымізмам».

Яшчэ адну нагоду для радасці беларускім заўзятарам даў фрыстайліст Дзмітрый Дашчынскі, які стаў пераможцам Кубка свету ў Канадзе. Трэба сказаць, што інтрыга ў размеркаванні прызавых месцаў захоўвалася да апошняга. У кваліфікацыі беларускі спартсмен паказаў толькі восьмы вынік, а ў суперфінал трапіў з апошняй чацвёртай пазіцыі. Аднак у заключным практыкаванні двухразовы прызёр Алімпіяды не пакінуў ніякіх шанцаў сваім канкурэнтам: канадца Трэвіса Герыца, які стаў другім, Дзмітрый апярэдзіў на 6 балаў. Пасля двух этапаў Дашчынскі займае трэцяе месца ў агульным заліку.

А вось беларускім гандбалістам пакуль не ўдалося адзначыцца перамогай на чэмпіянаце свету. У першым матчы на мундыляле падапечныя Юрыя Шаўцова ў барацьбе саступілі палякам 22-24. Не задаўся першы тайм, было шмат памылак у нападзенні. Напэўна, адбівалася перадстартавае хваляванне. Апошні раз на сусветным першынстве беларуская зборная выступала — страшна сказаць — амаль 20 гадоў таму! Так што некаторую нервовасць нашых гандбалістаў патлумачыць нескладана: вакол каманды ў апошні час небывалы ажыятаж — спадзяванні заўзятараў, функцыянераў, прэсінг з боку прэсы. Тым не менш ужо ў другой палове сустрэчы гульня нашых спартсменаў змянілася кардынальна: атакі сталі больш рэзультатыўнымі, а варатар зборнай Віталь Чарапенька ўвогуле дэманстраваў цуды абарончага майстэрства. Матч відавочна працягваўся пад дыктоўку беларусаў, але перавага польскай каманды ў першым тайме прынесла свой плён.

Галоўны трэнер каманды Юрый Шаўцоў застаўся задаволены гульнёй сваіх падапечных: «У прынцыпе, вынік нармальны. Зразумела, што сапернікі выглядалі больш упэўнена. Выратаваць матч можна было, але ў вырашальных эпізодах зноў нарабілі памылак. І ёсць праблемы ў нападзенні. У нашай атакі заўсёды выпадаюць адзін-два гульцы, а толькі Сяргей Рутэнка цягнуць каманду не можа. З наступнымі сапернікамі будзе яшчэ больш складана, бо трэба хутка рабіць работу над памылкамі».

Застаецца спадзявацца, што перадстартавая нервовасць саступіць месца камандnаму заспакаенню і далейшыя вынікі нашых хлопцаў будуць супадаць з чаканнямі заўзятараў.

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ

■

■ Як жывяце, землякі?

Брэстчына

ПОМНІК НОБЕЛЕЎСКАМУ ЛАЎРЭАТУ

У Брэсце сёлета будзе пастаўлены помнік Бегіну

Летам гэтага года спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння сёмага прэм'ер-міністра Дзяржавы Ізраіль. А нарадзіўся Менахім Бегін у Брэст-Літоўску. Ідэю ўстанавіць бюст на радзіме аднаго з самых вядомых ізраільскіх прэм'ераў выказаў стратэгічны саветнік прэзідэнта Ізраіля Ёрам Доры на сустрэчы са старшынёй Брэсцкага аблвыканкама Канстанцінам Сумарам. Беларускі бок падтрымаў прапанову. Больш за тое, на адкрыццё помніка вырашана запрасіць прэзідэнта Ізраіля Шымона Перэса, які нарадзіўся ў 1923 годзе таксама ў Беларусі.

Стала вядома, што стварацьпомнік будуць брэсцкія майстры скульптуры і архітэктуры. Фінансаваць праект узяўся ізраільскі бок.

Яна СВЕТАВА.

Віцебшчына

ТОЛЬКІ ЖАНІЦЕСЯ!

У Віцебску пачнуць будаваць новы будынак ЗАГСа

Як ні дзіўна, у абласным цэнтры і зараз няма добрага Палаца шлюбаў. ЗАГС гарвыканкама знаходзіцца на першым паверсе звычайнага шматпавярховага жылога дома на вуліцы Леніна.

Ідэя ўзвядзення на беразе Заходняй Дзвіны вялікага Палаца шлюбаў некалькі гадоў таму была агучана старшынёй Віцебскага аблвыканкама Аляксандрам Косінцам, калі абмяркоўваліся планы развіцця Віцебска. Губернатар тады асабіста наведаў цяперашні гарадскі ЗАГС, які размяшчаецца ва ўбудаваным памяшканні жылога дома. Безумоўна, у горадзе ўжо даўно наспела пытанне аб будаўніцтве шыкоўнага Палаца шлюбаў. Аляксандр Косінец тады прапанаваў, на яго погляд, лепшае месца для будучай новабудоўлі — плошчу 1000-годдзя Віцебска. Побач размешчаны найстарэйшы віцебскі храм XII стагоддзя — Благавешчанскі сабор і парк Пераможцаў з фантанамі і прыгожай набярэжнай. Тут вельмі любяць фатаграфавацца маладыя сямейныя пары, бавяць час сем'і з дзецьмі. Фінансаванне будаўніцтва ЗАГСа (а ў ім задумана стварыць цэлы комплекс, у тым ліку і з сэрвісам для маладых — вясельны салон і іншае) прадугледжана інвестыцыйнай праграмай Віцебска на бягучы год.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Гомельшчына

У ПАДАРУНАК — САЦЫЯЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ

Да 75-годдзя ўтварэння Гомельскай вобласці прымеркавана сённяшняе адкрыццё ў аграгарадку Веляцін Хойніцкага раёна адноўленага сельскага Дома культуры

На рэканструкцыю ўстановы культуры для паўтысячнага населенага пункта з абласнога бюджэту накіравана больш як 3,2 млрд рублёў. Для клуба набыты камплект гукаўзмацняльнай апаратуры, камп'ютарная тэхніка, крэслы ў глядзельную залу. У сельскім Доме культуры адначасова размяшчаецца і бібліятэка, кнігамі якой карыстаецца палова жыхароў аграгарадка.

Сёння ж у Добрушы адкрываецца яшчэ адзін дзіцячы дом сямейнага тыпу. Бацькі-выхавальнікі Наталля і Аляксандр Шэдавы сталі пераможцамі адпаведнага раённага конкурсу. Іх двое дзяцей ужо дарослыя і маюць свае сем'і. Сёння бацькі выхоўваюць сем прыёмных дзяцей: Аляксандру Сільчанка, Таццяну і Дзмітрыя Фамянковых, Данііла, Сяргея і Мікалая Купрэнкаў, а таксама Аляксея Шаўчэнку. Бацькі-выхавальнікі надаюць шмат увагі адукацыі дзяцей, навучаюць іх самаабслугоўванню, здароваму ладу жыцця. Дарэчы, іх дзеці былі пераможцамі абласнога конкурсу агітбрыгад «Мы за здаровы лад жыцця!». Аляксандра Сільчанка стала пераможцай 1 этапу абласной алімпіяды па матэматыцы. Будаўніцтва жылога дома, плошча якога складае амаль 200 кв.м, ажыццяўлялася ў адпаведнасці з Дзяржаўнай інвестыцыйнай праграмай. Акрамя бюджэтных укладанняў, прадпрыемствы, арганізацыі і індывідуальныя прадпрымальнікі аказалі гэтай вялізнай і дружнай сям'і спонсарскую дапамогу. У тым ліку набылі посуд, матрацы для ложкаў, пасудамыйную машыну, бытавую тэхніку...

Дарэчы, адначасова ў гарадскім пасёлку Камарын Брагінскага раёна ўводзіцца ў эксплуатацыю новы будынак аддзялення круглясутачнага знаходжання грамадзян пажылога ўзросту, якое адносіцца да Брагінскага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Гродзеншчына

У ГРОДНЕ ЛЮБЯЦЬ СНЕГ

Гродна далучыцца да Сусветнага дня снегу, які адзначаць больш чым у 40 краінах свету адначасова

Як вядома, з 20 студзеня мінулага года ў многіх краінах свету пачалі адзначаць новае свята — Дзень снегу. Ініцыятарам увядзення гэтага мерапрыемства выступіла Міжнародная федэрацыя лыжнага спорту. Дарэчы, як паведамляецца на афіцыйным сайце Беларускага лыжнага саюза, які з'яўляецца каардынатарам Сусветнага дня снегу ў Беларусі, ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі 19 і 20 студзеня пройдуць спаборніцтвы, прадстаўленні і конкурсы.

У Гродне і Гродзенскім раёне будуць арганізаваны лыжныя гонкі, а таксама спартыўнае свята з перацягваннем каната, баямі на бервяне, сямейнымі конкурсамі і эстафетай на санках.

Антон ЗАПОЛЬСКІ.

Магілёўшчына

КУЛЬТУРНАЯ СТАЛІЦА — НА КАНВЕРЦЕ

Гашэнне мастацкіх канвертаў з арыгінальнай маркай «Магілёў — культурная сталіца Беларусі 2013», выпушчаных Міністэрствам сувязі, прайшло ў Магілёве

Трэба сказаць, што гашэнне канвертаў спецыяльным штэмпелем прайшло ва ўсіх 30 аддзяленнях сувязі горада. Канверты наўрад ці з'явяцца ў звычайным продажы. Зараз іх выкупляюць калекцыянеры па некалькі дзясяткаў штук. Кошт аднаго канверта — 1450 рублёў. Мастаком канверта і спецыяльнага штэмпеля з'яўляецца Ганна Малаш. На месцы маркі нанесены надпіс «Магілёў — культурная сталіца Беларусі-2013» на беларускай мове, намаляваны герб горада, фрагмент нямецкай гравюры XVIII стагоддзя. У якасці малюнка на канверце — выява сучаснай гарадской забудовы, Ратуша, Свята-Мікольскі сабор, будынак Магілёўскага абласнога мастацкага музея імя Паўла Масленікава. Пад ілюстрацыяй таксама надпіс аб тым, што Магілёў з'яўляецца культурнай сталіцай Беларусі ў гэтым годзе. На штэмпелі намалявана магілёўская Ратуша, указана дата і месца гашэння.

Міхась ФІРСАЎ.

Міншчына

СТАДЫЁН У БАРЫСАВЕ, БАСЕЙН У БЕРАЗІНО

Фізкультурна-аздараўленчыя комплексы будуць пабудаваны сёлета таксама ў Стоўбцах, Чэрвені і Валожыне

Аб гэтым паведаміў карэспандэнту БелТА намеснік начальніка ўпраўлення фізічнай культуры, спорту і турызму Мінаблвыканкама Вячаслаў Шыпароў. «У праектах кожнага з гэтых фізкультурна-аздараўленчых комплексаў прадугледжаны 25-метровы басейн, спартыўная зала з трыбунамі, зала барацьбы, трэнажорная зала, аднаўленчы цэнтр, кавярня», — адзначыў суразмоўца. Сёлета таксама плануецца ўвесці ў эксплуатацыю плавальны басейн у Беразіно. Будзе завершана і будаўніцтва футбольнага стадыёна ў Барысаве. Спартыўнае збудаванне па праекце славенскай кампаніі Ofis arhitekti стане новай хатняй арэнай футбольнага клуба БАТЭ. Стадыён будзе адпавядаць усім патрабаванням УЕФА, тут можна будзе праводзіць матчы міжнароднага ўзроўню. Аб'ект зможа змясціць 13 тыс. гледачоў.

Як паведамілі ў фінансавым упраўленні Мінскага аблвыканкама, на фінансаванне фізічнай культуры і спорту ў 2013 годзе са сродкаў бюджэту сталічнай вобласці прадугледжана выдаткаваць больш як 182 млрд рублёў.

У РЭГІЁНЕ

ЖЫЦЦЁ Ў СВЕЦЕ ЦЕМРЫ

Карэспандэнты «Звязды» правялі некалькі гадзін разам з невідушчым чалавекам

Існуе стэрэатып, што невідушчыя людзі вельмі абмежаваныя ў сваіх магчымасцях. Але на самой справе яны імкнуцца жыць так, як і мы з вамі. Ходзяць на працу, у крамы, чытаюць кнігі, слухаюць музыку, карыстаюцца, па магчымасці, дасягненнямі камп'ютарнай тэхнікі. Але робяць гэта ў цемры. Кожны дзень для іх — гэта сапраўднае выпрабаванне на трываласць. Наколькі ж прыстасавана наша асяроддзе да людзей, якія не бачаць фарбы навакольнага свету, не могуць загадзя абысці фізічную перашкоду на сваім шляху?

«Я скончыла звычайную школу...»

Сустрэча з Анжэлай Мартысевіч прызначана на прыпынку «Захад-4». Гэты раён сталіцы адметны тым, што тут кампактна пражываюць сляпыя і слабавідушчыя людзі. Аб гэтым няцяжка і здагадацца: спецыяльныя ярка-жоўтыя металічныя канструкцыі абмяжоўваюць тратуар...

У прызначаны час да прыпынку падыходзіць прыгожая маладая дзяўчына. Каб не бела-чырвоны кій у руках, то і не здагадаешся, што яна не бачыць...

— Праблемы са зрокам у мяне былі яшчэ з маленства. Але яны не перашкодзілі скончыць звычайную агульнадукацыйную школу, — успамінае Анжэла. — Пасля паступіла ў педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка. На першай сесіі рыхтавалася да іспыту па гісторыі Беларусі. І злавіла сябе на тым, што перастала бачыць надрукаваны тэкст! Пасля было некалькі аперацый на вачах, але выратаваць зрок, на жаль, не атрымалася... Безумоўна, жыццё працягваецца, нягледзячы на такі круты паварот. Ды і не ўсё згублена. Урачы сказалі, што шанц аднавіць зрок ёсць. Аднак пакуль што гэта можна зрабіць толькі за мяжой...

Першапачаткова не магла прымусіць сябе хадзіць са спецыяльным кіем. З роднага Белаазёрска нават прывезла парасон, і з дому выходзіла з ім. Маці доўга пераконвала, што кій з бела-чырвонай расфарбоўкай патрэбен, ён сігналізуе, што ім карыстаецца невідушчы чалавек.

Дарэчы, вучобу ва ўніверсітэце я не кінула. Праўда, на дзённым аддзяленні вучыцца больш не магла, таму была вымушана сысці на «завочку».

У краме

Каб высветліць, наколькі ж прыстасавана звычайная крама для невідушчых людзей, Анжэла прапануе правесці невялікі эксперымент. Для яго абралі магазін закрытага акцыянернага таварыства «Комвак» на рагу вуліц Якубоўскага і Адзінцова — гэта адзін прыпынак да яе інтэрната. Дзяўчына ўваходзіць у краму і проста стаіць з бела-чырвоным кійком, каб да яе падышлі і дапамаглі купіць сок. Сама ж па гандлёвых радах не ідзе, каб штосьці незнарок не пабіць. Мінае хвілін пяць — Анжэла працягвае заставацца на тым жа месцы. Хоць побач праходзіць шмат пакупнікоў... Разам з фотакарэспандэнтам падыходзім да вітрыны, «ловім» аднаго з прадаўцоў і кажам, што ў гандлёвай зале знаходзіцца невідушчы чалавек. Праз пару хвілін Анжэла з пакупкамі ўжо стаіць у чарзе ў касу. Прадавец не толькі дапамагае ёй разлічыцца, але і складвае тавары ў пакет. А мы падыходзім і «здымаем» з сябе інкогніта.

— Невідушчыя людзі да нас заходзяць часта, бо яны тут кампактна пражываюць. Таму заўжды гатовы дапамагчы ім. Але шкада, што ніхто з пакупнікоў не падышоў да прадаўцоў і не растлумачыў сітуацыю. Шчыра кажучы, непрыемна здзіўлена такой людской чэрствасцю, — кажа прадавец крамы Вольга Саўчыц.

— Вось таму мы рэгулярна пасылаем у краму «ганца», у якога ёсць спіс неабходных пакупак і патрэбная сума грошай, — дадае Анжэла.

Фота Надзеі БУЖАН.

Разлічыцца Анжэле дапамагае прадаўшчыца Вольга Саўчыц.

Няпростая дарога дадому

Пасля паходу ў краму чакаем аўтобус 116-га маршрута, каб даехаць да інтэрната. Шлях наш недалёкі: выходзіць трэба на наступным прыпынку. Месца Анжэле ўступіў... пенсіянер. Пасажыры сярэдняга ўзросту адварочваліся і моўчкі аглядалі краявіды з акна аўтобуса...

— Самы адаптаваны для невідушчых людзей від гарадскога транспарту — гэта метро. Персанал станцыі заўсёды дапамагае спусціцца на перон, увайсці ў вагон. Станцыі аб'яўляюцца. Але ж метро па кожнай вуліцы не пракладзена... Наземным транспартам чалавеку, які не бачыць, карыстацца куды горш. Па-першае, пры пасадцы даводзіцца спадзявацца толькі на дапамогу пасажыраў ці кандуктара. Па-другое, раз-пораз здараецца так, што гукавы інфарматар увогуле маўчыць. І рызыка заехаць у невядомыя мясціны павялічваецца, — гаворыць Анжэла.

Але апошнім часам назіраюцца істотныя перамены. Так, на станцыях метрапалітэна з'явіліся ярка-жоўтыя рыфлёныя палосы. У гэты ж колер пафарбаваны і краі прыступак у наземным транспарце. Больш за тое, на лініі выходзяць усё больш аўтобусаў, тралейбусаў і трамваяў, дзе прыступкі перад дзвярыма адсутнічаюць увогуле.

Аўтобус спыняецца каля падземнага пераходу. Побач з ім — спецыялізаванае прадпрыемства інвалідаў па зроку «Святлопрыбор». Падземны шлях спецыяльна абсталяваны для невідушчых людзей — на гэта паказваюць адмысловыя ярка-жоўтыя парэнчы. Але...

— За тры дні да Новага года гэты пераход з-за дажджоў і адлігі затапіла, — успамінае дзяўчына. — І каб патрапіць на той бок вуліцы, даводзілася выбіраць з трох шляхоў, адзін за аднаго горшы. Ісці некалькі соцень метраў да бліжэйшага святлафора па галалёдзе ці пераходзіць ажыўленую дарогу, штосекундна рызыкуючы трапіць пад колы аўтамабіляў? Давялося «плысці» па праходзе, дзе вады было амаль па калена...

Аднак перайсці дарогу пад зямлёй можна далёка не ўсюды нават у цэнтральнай частцы сталіцы. Што ўжо казаць пра спальныя раёны!

— Пакуль што назваць гарадскую інфраструктуру максімальна прыдатнай да невідушчых людзей не выпадае, — лічыць **намеснік старшыні Цэнтральнага праўлення Беларускага таварыства інвалідаў па зроку Міхаіл АНТОНЕНКА**. — Напрыклад, сталіца вельмі адстае па колькасці агучаных святлафораў. У той жа Брэсцкай вобласці праца вядзецца куды больш актыўна. На абласным узроўні прынята рашэнне, што ўсе святлафорныя аб'екты павінны быць агучаны! Іншае пытанне — тэхнічны складнік. Апараты састарэлай канструкцыі моцна гудзяць і таму ствараюць дыскамфорт для мясцовых жыхароў. Аднак у краінах Заходняй Еўропы гэтая праблема даўно вырашана. Узровень гуку святлафора наўпрост залежыць ад шуму вакол. Калі на дарозе ціха, то і сігнал будзе падавацца нягучна...

— Па стане на снежань 2012 года ў Мінску ўстаноўлены 28 агучаных святлафораў. Сёлета іх стане больш. Спецыяльны спіс знаходзіцца ў распрацоўцы, — паведамілі «Звяздзе» ва ўпраўленні ДАІ ГУУС Мінгарвыканкама.

Невідушчым ад нараджэння шрыфт Брайля засвоіць лягчэй

Заходзім у інтэрнат. Свой пакой Анжэла знаходзіць лёгка — на дзвярах шрыфтам Брайля выбіты нумар. Заходзім і бачым на канапе таўшчэзны буквар.

Фота Надзеі БУЖАН.

Зарыентавацца ў прасторы дапамагаюць спецыяльныя парэнчы.

— Па праўдзе кажучы, мне цяжкавата засвоіць шрыфт Брайля. Справа ў тым, што ў невідушчых ад нараджэння людзей адчувальнасць кончыкаў пальцаў вельмі высокая. А ў чалавека, які перастаў бачыць у свядомым узросце, такой ярка выражанай уласцівасці няма — усё прыходзіць пакрысе. Таму пакуль што больш карыстаюся аўдыякнігамі. З аднаго боку, гэта зручней, бо бібліятэка для невідушчых адна на сталіцу. Каб там узяць кнігу, надрукаваную шрыфтам Брайля, трэба ехаць праз паўгорада як мінімум з адной перасадкай. З другога боку, і спампаваць на камп'ютар электронную ці аўдыякнігу не так проста. Для гэтага трэба ўвесці адпаведны код, які з'яўляецца на маніторы. А спецыяльная праграма агучвае іх проста: «Графіка»...

Сёлета ў Беларусі будуць надрукаваны шрыфтам Брайля 38 кніг

Намеснік дырэктара выдавецтва «Народная асвета» Уладзімір ЦЕЛЕШ гаворыць, што шрыфтам Брайля друкуецца пераважна вучэбная літаратура:

— Сёлета мы плануем выдаць для невідушчых 38 кніг. Большасць з іх — гэта падручнікі. Але не забываемся і на мастацкую літаратуру. Так, шрыфтам Брайля будуць надрукаваны творы Міхаіла Булгакава, Аляксандра Салжаніцына, Міхаіла Шолахава. Таксама свет убачыць зборнік твораў Максіма Гарэцкага. Але трэба ўлічваць, што аб'ём кнігі, надрукаванай такім спосабам, павялічваецца ў чатыры-пяць разоў у параўнанні са звычайнай. Акрамя таго, спецыяльнае абсталяванне, якое дазваляе друкаваць кнігі шрыфтам Брайля, знаходзіцца толькі ў адной тыпаграфіі — адкрытага акцыянернага таварыства «Чырвоная зорка».

Замест эпілога

Тым часам Анжэла завіхаецца па гаспадарцы. Яна спрактыкавана мые посуд, палівае кветкі, кладзе на стол буквар. Неўзабаве ёй выходзіць на працу. Напарадзе васьмігадзінная змена на заводзе.

— У Белаазёрску для мяне працы не знайшлося. Але змагла ўладкавацца на мінскі «Святлопрыбор». Працую там слесарам механазборачных работ. Так, гэтая прафесія не зусім жаночая. Але працаваць трэба, калі для гэтага ёсць магчымасць. Галоўнае — гэта не зламацца псіхалагічна... І я не магу сядзець склаўшы рукі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

■ Тэт-а-тэт

ЯК СТАЦЬ ШЧАСЛІВЫМ?

Калісьці ён прайграў мне ў адным кулінарным тэлешоу. Гатуючы фарфале аль дэнтэ з курыцай і шампіньёнамі пад соусам бешамель (прыпраўленымі па задумцы — для цікавінкі — сезамкамі і макам), я, «зялёная» яшчэ рэдактарка, рыхтавалася тады змагацца з вопытным акцёрам. Сёння ж ён, Дзмітрый Сеннікаў, сказаў, што мне няма патрэбы прадстаўляцца, а сам — прадставіўся:

— Матывацыйны спікер, спецыяліст па публічных выступленнях і коўч асобасных магчымасцяў.

— Вось-вось, гэта і адбылося ў маім жыцці. Не магу сказаць, што тыя трэнінгі і семінары, якія я прайшоў, пачалі выкарыстоўвацца мною на практыцы адразу. Але затым узнікла думка: а навошта? Навошта я ахвяраваў і час, і грошы? Каб пакласці на паліцу чарговы дыплом? І гэта падзвігла мяне на яшчэ больш шчыльнае самапазнанне, на далейшыя самаадукацыю і самараэвіццё. Цяпер я ўжо магу дапамагаць не толькі сабе, але і іншым людзям: тым, хто разумее, што нешта не так у іх жыцці, і хоча, каб было «так».

— І гэта датычыцца любых праблем, у любой сферы? Коўч-падыходы здольныя дапамагчы кожнаму аднолькава паспяхова?

— Менавіта так. Можна сказаць, што гэта ўніверсальны метад дапамогі. Выступаючы як матывацыйны спікер, я, безумоўна, выкарыстоўваю элементы коўчынгу, каб паказаць, як і што можа змяніцца ў жыцці чалавека. На асабістых прыкладах — часта і нават, можа быць, у першую чаргу. Такім чынам я даю людзям зразумець, што я «пабыў у іх скуры»: былы няўдачнік, які потым захацеў, каб нешта атрымалася, — і атрымалася.

Пры размове з чалавекам амаль адразу пачынаеш адчуваць, ці рэальна вырашыць яго праблему пры дапамозе коўчынгу або яна ўсё ж патрабуе ўдзелу спецыялістаў з больш глыбокімі падыходамі. Таму што часам у стварэнні праблемы бываюць задзейнічаны аспекты, закладзеныя яшчэ ў дзяцінстве. Дарэчы, калі такая застарэлая псіхалагічная траўма не вельмі глыбокая, то выйсці на новы віток свайго жыцця пры дапамозе коўчынгу — гэта магчыма.

— Як гэты самы коўчынг працуе на практыцы?

— Проста, як усё геніяльнае. Гэта не псіхааналіз, не псіхатэрапія і нават не кансультацыя. Тут існуе закон: дасі кліенту параду — вернеш грошы. Адказнасць за ўсё, што будзе адбывацца далей, чалавек павінен цалкам прымаць на сябе. А я проста расказваю, як гэта зрабіць. Мне вельмі падабаецца падыход майго настаўніка: ён кажа, што кожны чалавек — геній. Дзівосная і ўнікальная асоба, якая заўсёды сама ведае адказы на ўсе свае пытанні. І хоць яны, адказы, прыйдуць звонку, а не знутры, ніхто нічога не навяжа, не параіць. Мы не зазіраем у мінулае: што там не атрымалася і чаму? У коўчынгу задаюцца адкрытыя пытанні, накіраваныя ў будучыню. Першае, праўда, у большасці выпадкаў напачатку «буксуе». А гучыць проста: чаго ты хочаш?

— Гэта ж самае складанае пытанне! Цікава, як адказвае чалавек, у якога ўсё добра, і што гаворыць той, у каго праблемы?

— Усё зноў вельмі проста. Чалавек, які па-сапраўднаму нечага хоча, сам ведае, што яму рабіць. Калі чалавек нечага не хоча, ён і гаворыць пра тое, чаго не хоча. А пакольскі думка, як усім ужо вядома, рэч матэрыяльная, то гэта і прыцягваецца ў яго жыццё, і чалавек заблытваецца ў кругавароце таго, чаго не хоча. Я праз гэта прайшоў: дакладна ведаючы, чаго не хачу, я меў гэта на працягу многіх гадоў. Выконваючы ролю ахвяры, чалавек у асноўным скардзіцца, абвінавачвае, саромеецца і гаворыць пра тое, чаго не хоча. Магчымасць зразумець чалавека правільна ёсць толькі пры правільна дадзеным ім адказе на першае пытанне. Бо калі чалавек гаворыць: «Я хачу быць шчаслівым», то гэта ні пра што. «Я хачу зарабляць больш грошай» — ні пра што таксама. «Я хачу пахудзець» — і гэта ні пра што. «Я хачу наладзіць адносіны — у сям'і або рамантычныя» — і гэта, па вялікім рахунку, ні пра што, таму што сіла — у яснасці, выразнасці. Чым больш яскрава мы ўяўляем канчатковы вынік, тым нам прасцей вызначыць шлях да яго — у выглядзе канкрэтных крокаў. Расплывісты ж адказ нагадвае, хутчэй, галюцынацыю. Хочаш зарабляць больш? Але калі кожны раз прасіць проста «больш», то задавальнення не будзе ніколі. І будзе ісці ўнутры сябе самога «прыватная размова» ў духу: «Што, не здолеў?».

Дзесяць разоў задаўшы суразмоўцу пытанне «Чаго ты хочаш?» і дзесяць разоў пачуўшы «не тое», рызыкуеш убачыць бездапаможную ўсмешку, а пасля — і раздражненне. Ну і няхай, бо пасля ён, суразмоўца, усё ж трапіць у злучэнне з Сусветам — і пачне, нарэшце, выкладаць тое, чаго яму хочацца. Тут ёсць яшчэ адзін пункт: каб праверыць, ці сапраўды агучанае з'яўляецца для чалавека жаданым, існуе пытанне нумар два: «Чаму для цябе гэта важна?»

— Стоп, стоп! Як усё ж павінен гучаць адказ на першае пытанне, пад дэвізам «пра нешта»?

— Ну, па першае, правільна гаварыць «я хачу», а не «я не хачу»: часціцу «не» пасады пазбаўляем, таму што мозг яе не ўспрымае. Калі чалавек гаворыць: «Я хачу зарабляць адну тысячу долараў у месяц», ён, згадзіцеся, канкрэтна вызначыўся з сумай. І на пытанне, чаму для яго гэта важна, таксама можа даць — сабе самому! — абгрунтаваны адказ: ён дакладна ведае, чаму менавіта тысячу, а не восемсот і не паўтары. Гэта ўжо рэальны крок да мары. А далей можна вызначыць, як дакладна яе дасягнуць. Натуральна, тут ёсць агаворка: трэба яшчэ, каб і мэта, фінансавая ці якая заўгодна, і механізмы яе дасягнення былі экалагічныя — каб, дасягнуўшы яе, не нашкодзіць іншым. Зарабляючы грошы, пастаянна прападаючы на працы, можна паставіць пад удар шчасце блізкіх людзей. За два месяцы да пачатку лета можна, безумоўна, прыдбаць новую фізічную форму, каб «зваліць» ёю ўсіх на пляжы, але такі паскораны курс наўрад ці не наробіць шкоды здароўю. Увогуле, чалавеку ўласціва зацыклівацца на адным і прапускаць нешта важнае ў іншым. Хтосьці сочыць за фігурай так пільна, што губляе магчымасць інтэлектуальнага развіцця. Нехта кідаецца ў рамантычныя адносіны — і цалкам забываецца на свае абавязкі. Увесь час нейкая сфера атрымліваецца пад ударам. А іх, між іншым, не так і шмат: духоўная, або асобаснага росту, або гэта можна назваць і верай — раз; бізнэс, грошы, фінансы — два; адносіны — рамантычныя, сямейныя, сяброўскія, з калегамі — тры; здароўе цела — чатыры. У большасці выпадкаў увага надзяляецца нейкім дзвюм, а дзве астатнія — пакутуюць. Каб развіцца гарманічна і валодаць спакоем і шчасцем, трэба развіваць усе чатыры. Паступова, патрохі, паціху, бо нешта заўсёды, безумоўна, пераважвае, і тады трэба свядома падцягваць астатняе — каб выраўняцца і адчуць сябе ўпэўнена.

— Ці былі сітуацыі, калі да вас звярталіся па дапамогу, а потым высвятлялася, што праблемы не існуе зусім або яна на самой справе залягае ў іншай сферы?

— Так бывае. Для такой вось «дыягностыкі» якраз і задаецца пытанне: «Чаму для цябе гэта важна?». Часцей праблема ўсё ж такі ёсць, — недзе па суседстве. І ўбачыць яе таксама магчыма толькі пры дапамозе размовы. Для гэтага існуюць канкрэтныя мадэлі. Але мяне пры навучанні ўвесь час хваляваламе: якое пытанне задаць наступным, каб прасунуць чалавека наперад, а не зацыкліць яго, пусціўшыся ў разважанні, ад якіх ён і без мяне пакутуе? Як выйсці на новы ўзровень? Аказалася, што зноў усё проста: калі ты шчыра адчуваеш жаданне дапамагчы чалавеку, то пытанні нараджаюцца самі.

— Геніяльны адказ.

— Проста факт. Калі я гэта зразумеў, такіх цяжкасцяў у мяне ўжо не ўзнікала. Ты ж, калі ўважліва чалавека слухаеш, задаеш яму нейкія спадарожныя пытанні — каб праясніць сітуацыю. Бо часам чалавек разумее, пра што ён гаворыць, але выкладае свае думкі не вельмі ясна. А ў яснасці, я паўтаруся, сіла. І калі слухаеш, то супераживаеш і не можаш не хацець дапамагчы. І тады пытанне — адкрытае, якое патрабуе разгорнутага адказу, разважання, — узнікае аўтаматычна. Вось яно якраз і накіравана ў будучыню: а як было б, калі б...? І чалавек пачынае разважаць, што б ён мог зрабіць заўтра, а не капацца ў дні ўчарашнім: што я зрабіў не так? Чалавек паспяховы, як і любы чалавек, які адчайна хоча перайсці ў гэты шэраг, задае сабе пытанне: «Што мне зрабіць наступным разам, каб дасягнуць поспеху?». Усе людзі думаюць пра адно і тое ж, і практычна аднымі словамі, але ў розных сэнсах. А як іншы сэнс, то іншы і вынік. Несумненна, праца над памылкамі патрэбна, але час на тое, каб іх разгледзець, можна патраціць на вырашэнне новых задач. Самая вялікая перашкода на шляху да поспеху — гэта чалавечы мозг, які, нягледзячы на ўсю сваю эвалюцыю, дагэтуль выконвае толькі адну функцыю: адказвае за інстынкт самазахавання. Нам заўсёды хочацца быць у зоне камфорту, дзе ўтульна, цёпла, добра. І толькі мы — адтуль, як мозг: ку-уды-ы? Але на «расслабоне» ў поспех не патрапіць...

Гутарыла Святлана ДЗЯНІСАВА

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

«АБ ДЗЯРЖАЎНЫХ ДАПАМОГАХ СЕМ'ЯМ, ЯКІЯ ВЫХОЎВАЮЦЬ ДЗЯЦЕЙ»

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 12 снежня 2012 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 20 снежня 2012 года

ГЛАВА 1
АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 1. Права на дзяржаўныя дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей

Права на дзяржаўныя дапамогі сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей (далей — дзяржаўныя дапамогі), у адпаведнасці з гэтым Законам маюць:

грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, а таксама замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якім прадастаўлены статус бежанца ў Рэспубліцы Беларусь;

грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, на якіх распаўсюджваецца дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне і за іх, а таксама імі самімі ў прадугледжаных заканадаўствам выпадках выплачваюцца абавязковыя страхавыя ўзносы на сацыяльнае страхаванне.

Дзяржаўныя дапамогі, прадугледжаныя гэтым Законам, не прызначаюцца на дзяцей, якія пражываюць за межамі Рэспублікі Беларусь (за выключэннем дзяцей, бацькі якіх працуюць у дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах Рэспублікі Беларусь), а таксама на дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў і якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні ў дзіцячых інтэрнацкіх установах, дзіцячых дамах сямейнага тыпу і прыёмных сем'ях.

На дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў і якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні ў апякунскіх сем'ях, прызначаюцца дзяржаўныя дапамогі, прадугледжаныя гэтым Законам, за выключэннем дзяржаўных дапамог, прадугледжаных артыкуламі 10 і 14 гэтага Закона.

Артыкул 2. Заканадаўства аб дзяржаўных дапамогах

Заканадаўства аб дзяржаўных дапамогах грунтуецца на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і складаецца з гэтага Закона і іншых актаў заканадаўства, у тым ліку міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь.

Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь устаноўлены іншыя правілы, чым тыя, якія змяшчаюцца ў гэтым Законе, прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора.

Артыкул 3. Віды дзяржаўных дапамог

У адпаведнасці з гэтым Законам прызначаюцца дзяржаўныя дапамогі: дапамогі па мацярынстве, сямейныя дапамогі, дапамогі па часовай непрацаздольнасці па доглядзе дзіцяці.

Да дапамог па мацярынстве адносяцца:

дапамога па цяжарнасці і родах;

дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці.

Да сямейных дапамог адносяцца:

дапамога у сувязі з нараджэннем дзіцяці;

дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў;

дапамога на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў, вызначаных гэтым Законам (далей — дапамога на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў);

дапамога на дзіця ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраванае вірусам імунадэфіцыту чалавека;

дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў.

Да дапамог па часовай непрацаздольнасці па доглядзе дзіцяці адносяцца:

дапамога па часовай непрацаздольнасці па доглядзе хворага дзіцяці ва ўзросце да 14 гадоў (дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў);

дапамога па часовай непрацаздольнасці па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў у выпадку хваробы маці альбо іншай асобы, якая фактычна ажыццяўляла догляд дзіцяці;

дапамога па часовай непрацаздольнасці па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў у выпадку яго санаторна-курортнага лячэння, медыцынскай рэабілітацыі.

Артыкул 4. Сродкі на выплату дзяржаўных дапамог, кантроль за іх мэтавым выкарыстаннем

Выплата дапамог па мацярынстве, у сувязі з нараджэннем дзіцяці, па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, па часовай непрацаздольнасці па доглядзе дзіцяці асобам, на якіх не распаўсюджваецца дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне і за іх, а таксама імі самімі ў прадугледжаных заканадаўствам выпадках выплачваюцца абавязковыя страхавыя ўзносы на сацыяльнае страхаванне, ажыццяўляецца за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання.

Выплата дапамог па мацярынстве, у сувязі з нараджэннем дзіцяці, па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў асобам, на якіх не распаўсюджваецца дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне, а таксама дапамог на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў, на дзіця ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраванае вірусам імунадэфіцыту чалавека, па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў ажыццяўляецца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

Кантроль за мэтавым выкарыстаннем сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання на выплату дзяржаўных дапамог ажыццяўляецца Фондам сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь (далей — Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва), сродкаў рэспубліканскага бюджэту — Міністэрствам фінансаў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 5. Правы і абавязкі дзяржаўных органаў, іншых арганізацый, якія прызначаюць і выплачваюць дзяржаўныя дапамогі

Дзяржаўныя органы, іншыя арганізацыі, якія прызначаюць і выплачваюць дзяржаўныя дапамогі, маюць права:

ажыццяўляць кантроль за дакладнасцю прадстаўленых грамадзянамі дакументаў і (або) звестак, неабходных для прызначэння і выплаты дзяржаўных дапамог;

запытваць і бязвыплатна атрымліваць у дзяржаўных органаў, іншых арганізацый незалежна ад іх арганізацыйна-прававых формаў інфармацыю, неабходную для прызначэння і выплаты дзяржаўных дапамог, а таксама для праверкі прадстаўленых грамадзянамі дакументаў і (або) звестак.

Дзяржаўныя органы, іншыя арганізацыі, якія прызначаюць і выплачваюць дзяржаўныя дапамогі, абавязаны:

забяспечваць комплексны падыход у прымяненні заканадаўства пры прызначэнні дзяржаўных дапамог, своечасовую выплату дзяржаўных дапамог;

захоўваць канфідэнцыйнасць інфармацыі, якая змяшчаецца ў прадстаўленых грамадзянамі дакументах і (або) звестках;

растлумачваць грамадзянам іх правы і абавязкі па пытаннях прызначэння і выплаты дзяржаўных дапамог у парадку, вызначаным заканадаўствам.

Артыкул 6. Правы і абавязкі грамадзян, якія атрымліваюць дзяржаўныя дапамогі

Грамадзяне, якія атрымліваюць дзяржаўныя дапамогі (далей — атрымальнікі дзяржаўных дапамог), маюць права на:

канфідэнцыйнасць інфармацыі, якая змяшчаецца ў прадстаўленых імі дакументах і (або) звестках дзяржаўным органам, іншым арганізацыям, якія прызначаюць і выплачваюць дзяржаўныя дапамогі;

атрыманне поўнай і дакладнай інфармацыі аб дзяржаўных дапамогах, парадку іх прызначэння і выплаты;

абскарджанне рашэнняў, прынятых па пытаннях прызначэння і выплаты дзяржаўных дапамог.

Атрымальнікі дзяржаўных дапамог абавязаны паведамляць аб наступленні абставін, якія цягнуць змену памеру дзяржаўнай дапамогі або спыненне яе выплаты, у пяцідзённы тэрмін з дня іх наступлення.

ГЛАВА 2
ДАПАМОГІ ПА МАЦЯРЫНСТВЕ

Артыкул 7. Дапамога па цяжарнасці і родах

Дапамога па цяжарнасці і родах прызначаецца ў сувязі з цяжарнасцю і родамі, а таксама ўсынаўленнем (удачарэннем), устанаўленнем апекі над дзіцем ва ўзросце да 3 месяцаў.

Права на дапамогу па цяжарнасці і родах маюць жанчыны:

занятыя дзейнасцю, у перыяд ажыццяўлення якой на іх распаўсюджваецца дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне і за іх, а таксама імі самімі ў прадугледжаных заканадаўствам выпадках выплачваюцца абавязковыя страхавыя ўзносы на сацыяльнае страхаванне;

з ліку ваенных, асоб радавога і кіруючага саставу органаў унутраных спраў, Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях;

якія атрымліваюць прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную, вышэйшую і паслядыпломную адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі, а таксама якія атрымалі такую адукацыю, — на працягу 2 месяцаў пасля яе атрымання;

якія праходзяць падрыхтоўку ў клінічнай ардынатуры ў вочнай форме;

якія зарэгістраваны ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў (далей — органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне) у якасці беспрацоўных альбо якія праходзяць прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі і навучальныя курсы па накіраванні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне;

якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гадоў.

Пры сурагатным мацярынстве дапамога па цяжарнасці і родах прызначаецца сурагатнай маці. Жанчыне, якая заключыла з сурагатнай маці дагавор сурагатнага мацярынства, дапамога па цяжарнасці і родах не прызначаецца.

Артыкул 8. Перыяд, на які прызначаецца дапамога па цяжарнасці і родах

Дапамога па цяжарнасці і родах прызначаецца за 30 тыдняў цяжарнасці на 126 каляндарных дзён, у выпадку ўскладненых родаў, у тым ліку нараджэння дваіх і больш дзяцей, — на 140 каляндарных дзён.

Жанчынам, якія пастаянна (пераважна) пражываюць і (або) працуюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання, дапамога па цяжарнасці і родах прызначаецца з 27 тыдняў цяжарнасці на 146 каляндарных дзён, у выпадку ўскладненых родаў, у тым ліку нараджэння дваіх і больш дзяцей, — на 160 каляндарных дзён.

У выпадку родаў, наступіўшых да 30 тыдняў цяжарнасці (да 27 тыдняў цяжарнасці ў жанчын, якія пастаянна (пераважна) пражываюць і (або) працуюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання), дапамога па цяжарнасці і родах прызначаецца на 140 каляндарных дзён (жанчынам, якія пастаянна (пераважна) пражываюць і (або) працуюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання, — на 160 каляндарных дзён), а ў выпадку нараджэння мёртвага дзіцяці — на 70 каляндарных дзён.

Асобе, якая ўсынавіла (удачарыла) дзіця альбо прызначана апекуном дзіцяці ва ўзросце да 3 месяцаў, дапамога па цяжарнасці і родах прызначаецца на 70 каляндарных дзён з дня ўсынаўлення (удачарэння) або ўстанаўлення апекі.

Артыкул 9. Памеры і ўмовы выплаты дапамогі па цяжарнасці і родах

Дапамога па цяжарнасці і родах прызначаецца ў памеры 100 працэнтаў сярэдняга заработка за ўсе месяцы перыяду, устаноўленага артыкулам 8 гэтага Закона, у наступных памерах:

жанчынам, якія працуюць на аснове працоўных дагавораў (кантрактаў), членства (удзелу) у юрыдычных асобах любых арганізацыйна-прававых формаў, — 100 працэнтаў сярэдняга заробку, вызначанага на ўстаноўленым парадку за 6 каляндарных месяцаў, якія папярэднічалі месяцу, у якім узнікла права на дапамогу па цяжарнасці і родах, але за кожны каляндарны месяц не больш за трохкратную велічыню сярэдняй заработнай платы працаўнікоў у рэспубліцы ў месяцы, які папярэднічаў месяцу наступлення водпуску па цяжарнасці і родах, і не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах;

жанчынам — індывідуальным прадпрымальнікам, прыватным натарыусам, адвакатам, творчым работнікам, жанчынам, якія ажыццяўляюць прадугледжаныя заканадаўчымі актамі віды рамеснай дзейнасці без дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў, жанчынам, якія працуюць у прадстаўніцтвах міжнародных арганізацый у Рэспубліцы Беларусь, дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах замежных дзяржаў, акрэдытаваных у Рэспубліцы Беларусь, —100 працэнтаў сярэдняга заработка, вызначанага на ўстаноўленым парадку за каляндарны год, які папярэднічаў году, у якім узнікла права на дапамогу па цяжарнасці і родах, але не больш за суму абавязковых страхавых узносаў, выплачаных за перыяд, за які вылічаецца даход, і не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах;

жанчынам, якія выконваюць работы па грамадзянска-прававым дагаворах, прадметам якіх з'яўляюцца аказанне паслуг, выкананне работ і стварэнне аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці, — 100 працэнтаў сярэднядзённай узнагароды, вызначанай на ўстаноўленым парадку, але не больш за суму абавязковых страхавых узносаў, выплачаных з узнагароды, з якой вылічаецца дапамога, і не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах;

жанчынам з ліку ваенных, асоб радавога і кіруючага саставу органаў унутраных спраў, Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях — 100 працэнтаў грашовага забеспячэння, якое захоўваецца ў вызначаным парадку за каляндарныя дні знаходжання іх у водпуску па цяжарнасці і родах, але за кожны каляндарны месяц не больш за трохкратную велічыню сярэдняй заработнай платы работнікаў у рэспубліцы ў месяцы, які папярэднічаў месяцу наступлення сацыяльнага водпуску па цяжарнасці і родах, і не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах.

Жанчынам, якія атрымліваюць прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную, вышэйшую і паслядыпломную адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі, а таксама якія праходзяць падрыхтоўку ў клінічнай ардынатуры ў вочнай форме, дапамога па цяжарнасці і родах прызначаецца ў памеры 100 працэнтаў сярэдняга заработка, вызначанага на ўстаноўленым парадку за каляндарны месяц перыяду, устаноўленага артыкулам 8 гэтага Закона, але не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах.

Жанчынам, якія праходзяць прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі і навучальныя курсы па накіраванні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, дапамога па цяжарнасці і родах прызначаецца ў памеры 100 працэнтаў сярэдняга заработка, вызначанага на ўстаноўленым парадку за каляндарны месяц перыяду, устаноўленага артыкулам 8 гэтага Закона, але не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах.

Жанчынам, якія атрымліваюць прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную, вышэйшую і паслядыпломную адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі, а таксама якія праходзяць падрыхтоўку ў клінічнай ардынатуры ў вочнай форме, дапамога па цяжарнасці і родах прызначаецца ў памеры 100 працэнтаў сярэдняга заработка, вызначанага на ўстаноўленым парадку за каляндарны месяц перыяду, устаноўленага артыкулам 8 гэтага Закона, але не менш за мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах.

Мінімальны памер дапамогі па цяжарнасці і родах у месяц устанаўліваецца ў памеры 50 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, зацверджанага Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, за два апошнія кварталы (далей — найбольшая велічыня бюджэту пражыткавага мінімуму) адносна кожнага месяца водпуску па цяжарнасці і родах.

Дапамога па цяжарнасці і родах жанчынам, перапічаным у абзацах другім — чацвёртым часткі першай гэтага артыкула, за якіх, а таксама якімі ў выпадках, вызначаных заканадаўствам, абавязковыя страхавыя ўзносы на сацыяльнае страхаванне выплачваліся менш чым за 6 месяцаў да ўзнікнення права на дапамогу па цяжарнасці і родах, устанаўліваецца ў мінімальным памеры.

Дапамога па цяжарнасці і родах выплачваецца аднаразова.

Парадак прызначэння і выплаты дапамогі па цяжарнасці і родах вызначаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Артыкул 10. Дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці

Права на дапамогу маюць жанчыны, у тым ліку сурагатныя маці, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя Рэспублікі Беларусь да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, рэгулярна наведвалі такія арганізацыі аховы здароўя і выконвалі загады ўрачоў-спецыялістаў на працягу ўсяго тэрміну цяжарнасці. Жанчыне, якая заключыла з сурагатнай маці дагавор сурагатнага мацярынства, такая дзяржаўная дапамога не прызначаецца.

Дапамога жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, прызначаецца і выплачваецца аднаразова ў памеры 100 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражыткавага мінімуму, дзейнага на дату нараджэння дзіцяці.

ГЛАВА 3
СЯМЕЙНЫЯ ДАПАМОГІ

Артыкул 11. Дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці

Права на дапамогу ў сувязі з нараджэннем дзіцяці маюць маці або бацька дзіцяці, асоба, якая ўсынавіла (удачарыла), прызначана апекуном дзіцяці ва ўзросце да 6 месяцаў.

Дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці прызначаецца і выплачваецца на кожнае дзіця аднаразова пры нараджэнні, усынаўленні (удачарэнні) у наступных памерах:

на першае дзіця — у памеры дзесяцікратнай найбольшай велічыні бюджэту пражыткавага мінімуму, дзейнага на дату нараджэння дзіцяці;

на другое і наступных дзяцей — у памеры чатырнаццацікратнай найбольшай велічыні бюджэту пражыткавага мінімуму, дзейнага на дату нараджэння дзіцяці.

Пры вызначэнні памеру дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці ўлічваюцца дзеці, у тым ліку ўсыноўленыя (удачароныя), а таксама пасынкі і падчарыцы ва ўзросце да 18 гадоў, якія выхоўваюцца ў сям'і, і не ўлічваюцца дзеці:

у дачыненні да якіх бацькі (адзіны з бацькоў) пазбаўлены бацькоўскіх правоў;

адабраныя з сям'і;

народжаныя мёртвымі;

якія выхоўваюцца ў прыёмных сем'ях, дзіцячых дамах сямейнага тыпу.

Пры прызначэнні дапамогі ў сувязі з нараджэннем дзіцяці апекуну на падапечнае дзіця яе памер вызначаецца ў залежнасці ад колькасці дзяцей, над якімі ўстаноўлена апека (папячыцельства).

Дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці не прызначаецца ў выпадках пакідання дзіцяці ў арганізацыі аховы здароўя, адмовы ад дзіцяці, адабрання дзіцяці, нараджэння мёртвага дзіцяці.

Сурагатным маці дапамога ў сувязі з нараджэннем дзіцяці не прызначаецца.

Артыкул 12. Дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў

Права на дапамогу па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў маюць маці (мачаха) або бацька (айчым), усынавіцель (удачарыцель), апякун дзіцяці. Іншыя члены сям'і або родныя дзіцяці маюць права на такую дапамогу ў выпадку знаходжання іх у водпуску па доглядзе гэтага дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гадоў.

Артыкул 13. Памеры і ўмовы выплаты дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў

Памер дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў вызначаецца, зыходзячы з сярэднямесячнай заработнай платы працаўнікоў у рэспубліцы, якая прымяняецца для вылічэння дапамогі ў адпаведнасці з часткай чацвёртай гэтага артыкула (далей — сярэднямесячная заработная плата).

Дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў прызначаецца і выплачваецца на кожнае дзіця ў наступных памерах:

на першае дзіця — 35 працэнтаў сярэднямесячнай заработнай платы;

на другое і наступных дзяцей — 40 працэнтаў сярэднямесячнай заработнай платы.

На дзіця-інваліда ва ўзросце да 3 гадоў дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў прызначаецца і выплачваецца ў памеры 45 працэнтаў сярэднямесячнай заработнай платы.

Для вылічэння дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў за перыяд з 1 лютага па 30 красавіка гэтага года прымяняецца сярэднямесячная заработная плата за IV квартал папярэдняга года, за перыяд з 1 мая па 31 ліпеня — за I квартал гэтага года, за перыяд з 1 жніўня па 31 кастрычніка — за II квартал гэтага года, за перыяд з 1 лістапада гэтага года па 31 студзеня наступнага года — за III квартал гэтага (папярэдняга) года.

У выпадку памяншэння сярэднямесячнай заработнай платы, якая прымяняецца для вылічэння дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, гэтая дапамога прызначаецца і выплачваецца ў памеры, вылічаным да яе памяншэння.

Дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў прызначаецца і выплачваецца ў памеры 50 працэнтаў ад памеру, устаноўленага часткамі другой і трэцяй гэтага артыкула, калі асоба, якая ажыццяўляе догляд дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў:

працуе на ўмовах поўнага працоўнага часу, няпоўнага працоўнага часу (больш за палову месячнай нормы працоўнага часу) у аднаго або некалькіх наймальнікаў;

працуе на ўмовах няпоўнага працоўнага часу (не больш за палову месячнай нормы працоўнага часу) і адначасова выконвае надомную працу ў аднаго або некалькіх наймальнікаў;

выконвае надомную працу больш як у аднаго наймальніка;

выконвае працу па грамадзянска-прававым дагаворы, прадметам якога з'яўляюцца аказанне паслуг, выкананне работ і стварэнне аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці;

з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, прыватным натарыусам, адвакатам;

ажыццяўляе прадугледжаныя заканадаўчымі актамі віды рамеснай дзейнасці без дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка;

атрымлівае паслядыпломную адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі і атрымлівае стыпендыю;

праходзіць падрыхтоўку ў клінічнай ардынатуры ў вочнай форме.

Асобам, якія ажыццяўляюць догляд дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў і адначасова атрымліваюць прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную або вышэйшую адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі, дапамога па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў прызначаецца і выплачваецца ў памеры, вылічаным да самай высокай з іх.

У выпадку, калі адзін з бацькоў (мачаха, айчым) з'яўляецца ваеннаслужачым, праходзіць тэрміновую ваенную службу, дапамога на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў прызначаецца, калі на дату звароту па такую дапамогу яна адносіцца да катэгорыі асоб, названых у абзацах другім — сёмым часткі другой гэтага артыкула.

Умовы прызначэння дапамогі на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў, прадугледжаныя часткамі другой і трэцяй гэтага артыкула, распаўсюджваюцца таксама на ўсынавіцеляў (удачарыцеляў), апекуноў (папячыцеляў).

Умова занятасці не менш як 6 месяцаў у годзе, які папярэднічаў году звароту па дапамогу на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў, не распаўсюджваецца на бацьку (айчыма), усынавіцеля (удачарыцеля), апекуна (папячыцеля), які ў годзе звароту па дапамогу на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў адносяцца да катэгорыі асоб, названых у абзацы сёмым часткі другой гэтага артыкула.

Артыкул 14. Дапамога на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў

Права на дапамогу на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў маюць маці (мачаха) або бацька (айчым), усынавіцель (удачарыцель), апякун (папячыцель) пры выхаванні імі дзіцяці, якое не знаходзіцца на дзяржаўным забеспячэнні, калі ў сям'і:

выхоўваецца дзіця-інвалід ва ўзросце да 18 гадоў;

выхоўваецца дзіця ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраванае вірусам імунадэфіцыту чалавека;

бацька (айчым) або ўсынавіцель (удачарыцель) з'яўляюцца ваеннымі, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу;

абое бацькоў (маці (мачаха), бацька (айчым)) у поўнай сям'і альбо адзіны з бацькоў у няпоўнай сям'і, усынавіцель (удачарыцель) з'яўляюцца інвалідамі I або II групы, а таксама калі адзін з бацькоў у поўнай сям'і з'яўляецца інвалідам I групы, а другі ажыццяўляе догляд яго і атрымлівае дапамогу, прадугледжаную заканадаўствам.

Дапамога на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў прызначаецца на кожнае дзіця ў памеры 50 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражыткавага мінімуму, а на дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў — у памеры 70 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражыткавага мінімуму.

Артыкул 15. Перыяд і ўмовы прызначэння дапамогі на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў

Дапамога на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў прызначаецца штогод з дня ўзнікнення права на яе пры захаванні ўмоў, прадугледжаных часткамі другой і трэцяй гэтага артыкула, і выплачваецца штомесяц:

на дзіця-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў — па дзень заканчэння тэрміну прызнання дзіцяці інвалідам, устаноўленага медыка-рэабілітацыйнай экспертнай камісіяй, уключна;

на дзіця, інфіцыраванае вірусам імунадэфіцыту чалавека, — па дзень спаўнення дзіцяці 18 гадоў уключна;

на іншых дзяцей, якія выхоўваюцца ў сем'ях, названых у абзацах другім — пятым часткі першай артыкула 14 гэтага Закона, якія:

не навучаюцца ва ўстановах адукацыі і не працуюць, — па дзень страты падставы, якая дае права на дапамогу на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў, уключна, але не пазней чым за дзень дасягнення імі ўзросту 16 гадоў;

з'яўляюцца навучэнцамі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі, — па дзень страты падставы, якая дае права на дапамогу на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў, але не пазней чым заканчэнне навучання (па чэрвень уключна);

атрымліваюць прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную і вышэйшую адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі за кошт уласных сродкаў, — па дзень страты падставы, якая дае права на дапамогу на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў, але не пазней чым за дзень дасягнення імі ўзросту 18 гадоў.

Дапамога на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў прызначаецца, калі на дату звароту па яе, а таксама не менш як 6 месяцаў у годзе, які папярэднічаў году звароту па такую дапамогу, працаздольны бацька (айчым) у поўнай сям'і альбо працаздольны бацька (маці) у няпоўнай сям'і з названых у абзацах другім — чацвёртым часткі першай артыкула 14 гэтага Закона:

працуе або ажыццяўляе іншы від дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь, які прыносіць заробак (даход), альбо працуе ў дыпламатычным прадстаўніцтве або консульскай установе Рэспублікі Беларусь;

з'яўляецца ваенным, асобай радавога і кіруючага саставу органаў унутраных спраў, Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях;

атрымлівае прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную, вышэйшую або паслядыпломную адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі;

праходзіць падрыхтоўку ў клінічнай ардынатуры ў вочнай форме;

зарэгістраваны ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў якасці беспрацоўнага з выплатай дапамогі па беспрацоўі альбо праходзіць прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі або навучальныя курсы па накіраванні гэтых органаў;

ажыццяўляе догляд дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў, з'яўляецца атрымальнікам пенсіі або штомесячнай страхавой выплаты ў адпаведнасці з заканадаўствам аб абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў, штомесячнага грашовага забеспячэння ў адпаведнасці з заканадаўствам аб дзяржаўнай службе, дапамогі па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, інваліда I групы, асобы, якая дасягнула 80-гадовага ўзросту, дапамогі на дзіця ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраванае вірусам імунадэфіцыту чалавека.

Маці (мачасе) у поўнай сям'і, у якой бацька (айчым) з'яўляецца ваеннаслужачым, праходзіць тэрміновую ваенную службу, дапамога на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў прызначаецца, калі на дату звароту па такую дапамогу яна адносіцца да катэгорыі асоб, названых у абзацах другім — сёмым часткі другой гэтага артыкула.

Умовы прызначэння дапамогі на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў, прадугледжаныя часткамі другой і трэцяй гэтага артыкула, распаўсюджваюцца таксама на ўсынавіцеляў (удачарыцеляў), апекуноў (папячыцеляў).

Умова занятасці не менш як 6 месяцаў у годзе, які папярэднічаў году звароту па дапамогу на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў, не распаўсюджваецца на бацьку (айчыма), усынавіцеля (удачарыцеля) з сям'і, названай у абзацы чацвёртым часткі першай артыкула 14 гэтага Закона, а таксама працаздольнага бацькі (айчыма) у поўнай сям'і альбо працаздольнага бацькі (маці) у няпоўнай сям'і, усынавіцеля (удачарыцеля), апекуна (папячыцеля), які ў годзе звароту па дапамогу на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў адносяцца да катэгорыі асоб, названых у абзацы сёмым часткі другой гэтага артыкула.

Артыкул 16. Дапамога на дзіця ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраванае вірусам імунадэфіцыту чалавека

Права на дапамогу на дзіця ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраванае вірусам імунадэфіцыту чалавека, маюць маці (мачаха) або бацька (айчым), усынавіцель (удачарыцель), апякун (папячыцель).

Дапамога на дзіця ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраванае вірусам імунадэфіцыту чалавека, прызначаецца і выплачваецца штомесяц у памеры 70 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту пражыткавага мінімуму.

Дапамога на дзіця ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраванае вірусам імунадэфіцыту чалавека, прызначаецца незалежна ад атрымання іншых відаў дзяржаўных дапамог.

Артыкул 17. Дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў

Права на дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў маюць маці (мачаха) або бацька (айчым), усынавіцель (удачарыцель), апякун (папячыцель) дзіцяці-інваліда альбо іншая асоба, якая фактычна ажыццяўляе догляд яго.

Дапамога па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў не прызначаецца і не выплачваецца асобам:

якія працуюць па працоўных дагаворах (кантрактах);

з ліку ваеннаслужачых, асоб радавога і кіруючага саставу органаў унутраных спраў, Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях;

якія выконваюць работы па грамадзянска-прававым дагаворах, прадметам якіх з'яўляюцца аказанне паслуг, выкананне работ і стварэнне аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці;

якія з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, прыватнымі натарыусамі, адвакатамі;

якія ажыццяўляюць прадугледжаныя заканадаўчымі актамі віды рамеснай дзейнасці без дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці індывідуальных прадпрымальнікаў;

якія атрымліваюць прафесійна-тэхнічную, сярэднюю спецыяльную, вышэйшую або паслядыпломную адукацыю ў дзённай форме атрымання адукацыі;

якія праходзяць падрыхтоўку ў клінічнай ардынатуры ў вочнай форме;

якія зарэгістраваны ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў якасці беспрацоўных або праходзяць прафесійную падрыхтоўку, перападрыхтоўку, павышэнне кваліфікацыі і навучальныя курсы па накіраванні органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне;

якія атрымліваюць пенсію або штомесячную страхавую выплату ў адпаведнасці з заканадаўствам аб абавязковым страхаванні ад няшчасных выпадкаў на вытворчасці і прафесійных захворванняў (за выключэннем непрацуючых маці (мачахі) або бацькі (айчыма), усынавіцеля (удачарыцеля), апекуна (папячыцеля) дзіцяці-інваліда, якія з'яўляюцца інвалідамі і атрымліваюць пенсію або штомесячную страхавую выплату), штомесячнае грашовае ўтрыманне ў адпаведнасці з заканадаўствам аб дзяржаўнай службе.

Маці (мачасе) або бацьку (айчыму), усынавіцелю (

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ «АБ ДЗЯРЖАЎНЫХ ДАПАМОГАХ СЕМ'ЯМ, ЯКІЯ ВЫХОЎВАЮЦЬ ДЗЯЦЕЙ»

(Заканчэнне. Пачатак на 4-й стар.)

на дапамогу ў сувязі з нараджэннем дзіцяці — дзень нараджэння дзіцяці;

на дапамогу жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, — дзень нараджэння дзіцяці;

на дапамогу па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да 3 гадоў — дзень прадастаўлення водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гадоў або дзень, які надыходзіць за днём заканчэння перыяду вызвалення ад працы (службы), вучобы, вызначанага лістком непрацаздольнасці па цяжарнасці і родах; для асоб, якія не маюць права на дапамогу па цяжарнасці і родах або не скарысталіся гэтым правам, — дзень нараджэння дзіцяці. Пры гэтым права на дзяржаўную дапамогу ўзнікае: для грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія пастаянна пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, у выпадку нараджэння дзіцяці за мяжой — не раней за дзень рэгістрацыі дзіцяці па месцы жыхарства аднаго з бацькоў (адзінага з бацькоў) у Рэспубліцы Беларусь; для замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія атрымалі дазвол на пастаяннае пражыванне ў Рэспубліцы Беларусь, — не раней за дзень унясення адзнакі аб рэгістрацыі па месцы жыхарства ў пасведчанне на права жыхарства ў Рэспубліцы Беларусь; для замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якім нададзены статус бежанца ў Рэспубліцы Беларусь, — не раней за дзень атрымання статусу бежанца ў Рэспубліцы Беларусь; для замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, — не раней за дзень падачы заявы аб жаданні ўдзельнічаць у праваадносінах па дзяржаўным сацыяльным страхаванні;

на дапамогу на дзяцей старэй за 3 гады з асобных катэгорый сем'яў — дзень, які надыходзіць за днём, калі дзіцяці споўнілася 3 гады; 1 студзеня года звароту па дзяржаўную дапамогу; дзень устанаўлення асобам, названым у абзацы пятым часткі першай артыкула 14 гэтага Закона, інваліднасці або прызнання дзіцяці інвалідам; дзень устанаўлення дыягназу дзіцяці, інфіцыраванаму вірусам імунадэфіцыту чалавека; дзень прызыву бацькі (айчыма), усынавіцеля (удачарыцеля) на тэрміновую ваенную службу; дзень скасавання шлюбу; дзень працаўладкавання або займання іншым відам дзейнасці, названых у абзацах другім—сёмым часткі другой артыкула 15 гэтага Закона; дзень выбыцця дзяцей з установ, названых у частцы дзясятай артыкула 20 гэтага Закона. Пры гэтым для сем'яў, у якіх бацька (айчым), усынавіцель (удачарыцель) з'яўляецца ваеннаслужачым, які праходзіць тэрміновую ваенную службу, права на дзяржаўную дапамогу ўзнікае не раней за дзень устанаўлення бацькоўства, заключэння шлюбу;

на дапамогу на дзіця ва ўзросце да 18 гадоў, інфіцыраванае вірусам імунадэфіцыту чалавека, — дзень устанаўлення дыягназу;

на дапамогу па доглядзе дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў — дзень прызнання дзіцяці інвалідам; дзень, які надыходзіць за днём звальнення або спынення іншага віду дзейнасці, названага ў абзацах другім—сёмым часткі другой артыкула 15 гэтага Закона, асобы, якая ажыццяўляе догляд дзіцяці-інваліда. Пры гэтым для асоб, якія знаходзяцца ў водпуску па доглядзе дзіцяці да дасягнення ім узросту 3 гадоў, акадэмічным водпуску, права на дзяржаўную дапамогу ўзнікае не раней за дзень прадастаўлення такога водпуску.

Пры звароце па дзяржаўныя дапамогі пасля заканчэння 6 месяцаў з дня ўзнікнення права на іх дзяржаўныя дапамогі прызначаюцца з дня звароту.

Пры звароце па дапамогі па цяжарнасці і родах, у сувязі з нараджэннем дзіцяці і жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыях аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, пасля заканчэння 6 месяцаў з дня ўзнікнення права на іх гэтыя дапамогі не прызначаюцца.

Артыкул 22. Абскарджанне рашэнняў па прызначэнні дзяржаўных дапамог

Рашэнні па прызначэнні дзяржаўных дапамог, прынятыя камісіямі па прызначэнні дапамог па месцы працы (службы), вучобы, могуць быць абскарджаны ў тэрытарыяльныя органы Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва па месцы пастаноўкі арганізацыі на ўлік у якасці плацельшчыка абавязковых страхавых узносаў.

Рашэнні па прызначэнні дзяржаўных дапамог, прынятыя тэрытарыяльнымі органамі Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва, могуць быць абскарджаны ў вышэйстаячы орган Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

Рашэнні па прызначэнні дзяржаўных дапамог, прынятыя органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне, могуць быць абскарджаны ў вышэйстаячы орган па працы. занятасці і сацыяльнай абароне.

У выпадку нязгоды з рашэннямі, прынятымі органамі, названымі ў частках першай—трэцяй гэтага артыкула, спрэчка вырашаецца ў судовым парадку.

Артыкул 23. Абставіны, якія цягнуць спыненне выплаты дзяржаўных дапамог

Выплата дзяржаўных дапамог спыняецца ў выпадку:

адмаўлення ад дзіцяці;

адмены ўсынаўлення (удачарэння), апекі (папячыцельства);

адабрання дзіцяці з сям'і;

змяшчэння дзіцяці ў дзіцячую інтэрнацкую ўстанову, установу адукацыі з кругласутачным рэжымам знаходжання;

пазбаўлення бацькоўскіх правоў атрымальніка дзяржаўнай дапамогі;

змянення месца выплаты дзяржаўнай дапамогі;

выезду дзіцяці за межы Рэспублікі Беларусь на тэрмін больш за 2 месяцы (за выключэннем дзяцей, бацькі якіх працуюць у дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах Рэспублікі Беларусь);

выезду атрымальніка дзяржаўнай дапамогі на пастаяннае месца жыхарства за межы Рэспублікі Беларусь;

смерці дзіцяці;

смерці атрымальніка дзяржаўнай дапамогі;

уступлення непаўналетняй асобы ў шлюб або нараджэння непаўналетняй маці дзіцяці;

у іншых выпадках, прадугледжаных гэтым Законам.

Артыкул 24. Парадак вяртання атрымальнікам дзяржаўнай дапамогі залішне выплачаных сум дзяржаўных дапамог

Залішне выплачаныя сумы дзяржаўных дапамог (з прычыны прадстаўлення дакументаў з загадзя недакладнымі звесткамі, непрадстаўлення або нясвоечасовага прадстаўлення звестак аб надыходзе абставін, якія цягнуць спыненне выплаты дзяржаўнай дапамогі, іншых змяненняў, якія ўплываюць на права атрымання дзяржаўнай дапамогі або на яе памер, а таксама з прычыны іншых пераплат) падлягаюць вяртанню атрымальнікам дзяржаўнай дапамогі.

У выпадку адмаўлення атрымальніка дзяржаўнай дапамогі ад вяртання залішне выплачаных сум дзяржаўных дапамог у добраахвотным парадку іх утрыманне робіцца з сум дзяржаўных дапамог, заработнай платы, грашовага забеспячэння, стыпендыі або іншага даходу на падставе рашэння камісіі па прызначэнні дапамог у памеры не больш за 20 працэнтаў ад дзейнага памеру дзяржаўнай дапамогі штомесячна да поўнага пагашэння запазычанасці. Пры спыненні выплаты дзяржаўнай дапамогі, заработнай платы, грашовага забеспячэння, стыпендыі або іншага даходу запазычанасць, якая засталася спаганяецца з атрымальніка дзяржаўнай дапамогі ў судовым парадку.

Сумы дзяржаўных дапамог, прызначаныя органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне і пералічаныя ў банкі пасля надыходу абставін, названых у артыкуле 23 гэтага Закона, падлягаюць вяртанню органам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне на падставе іх распараджэнняў. Калі на момант паступлення ў банк распараджэння сумы дзяржаўных дапамог выдадзены, іх спагнанне ажыццяўляецца ў парадку, вызначаным часткай другой гэтага артыкула.

Артыкул 25. Выплата дзяржаўных дапамог за мінулы час

Прызначаныя сумы дзяржаўных дапамог, не запатрабаваныя своечасова, выплачваюцца аднаразова за мінулы час, але не больш чым за 3 гады да звароту па атрыманне дзяржаўнай дапамогі.

Сумы дзяржаўных дапамог, не прызначаныя і (або) не атрыманыя своечасова па віне органа, які прызначае або выплачвае дзяржаўныя дапамогі, выплачваюцца аднаразова за мінулы час без абмежавання якім-небудзь тэрмінам і падлягаюць індэксацыі за гэты тэрмін у парадку, вызначаным заканадаўствам.

Сумы дзяржаўных дапамог, якія належаць атрымальніку дзяржаўнай дапамогі і не атрыманыя ў сувязі з яго смерцю, выплачваюцца асобе, якая мае ў адпаведнасці з гэтым Законам права на дзяржаўныя дапамогі. Патрабаванні аб выплаце названых сум дзяржаўных дапамог могуць быць прад'яўлены не пазней за 6 месяцаў з дня смерці атрымальніка дзяржаўнай дапамогі.

У выпадку неатрымання на працягу 6 месяцаў запар прызначаных органамі па працы, занятасці і сацыяльнай абароне дзяржаўных дапамог, якія выплачваюцца праз аб'екты паштовай сувязі, арганізацыі, якія ажыццяўляюць дзейнасць па дастаўцы пенсій і дапамог, іх выплата прыпыняецца з першага чысла месяца, які надыходзіць за месяцам, у які скончыўся шасцімесячны тэрмін. Аднаўленне выплаты дзяржаўнай дапамогі ажыццяўляецца з дня, які надыходзіць за днём прыпынення яго выплаты, пры ўмове, што атрымальнік дзяржаўнай дапамогі меў права на дзяржаўную дапамогу за перыяд, на працягу якога дзяржаўная дапамога не выплачвалася.

Артыкул 26. Перараздзел памераў дзяржаўных дапамог

Памеры дзяржаўных дапамог, вызначаныя часткай пятай артыкула 9, артыкуламі 14, 16 і 17 гэтага Закона, пералічваюцца з 1 лютага, 1 мая, 1 жніўня, 1 лістапада ў сувязі з павелічэннем бюджэту пражыткавага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва.

Памеры дзяржаўнай дапамогі, вызначаныя артыкулам 13 гэтага Закона, пералічваюцца з 1 лютага, 1 мая, 1 жніўня, 1 лістапада ў сувязі з ростам сярэднямесячнай заработнай платы.

ГЛАВА 6
ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Артыкул 27. Прызнанне страціўшымі сілу некаторых заканадаўчых актаў і асобных палажэнняў законаў

Прызнаць страціўшымі сілу:

1. Закон Рэспублікі Беларусь ад 30 кастрычніка 1992 года «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 27, ст. 473).

2. Закон Рэспублікі Беларусь ад 2 ліпеня 1977 года «Аб унясенні змянення і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» (Ведамасці Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, 1997 г., № 24, ст. 462).

3. Закон Рэспублікі Беларусь ад 6 студзеня 1999 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 4, 2/8).

4. Закон Рэспублікі Беларусь ад 19 сакавіка 2002 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2002 г., № 35, 2/843).

5. Закон Рэспублікі Беларусь ад 12 снежня 2005 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2005 г., № 196, 2/1166).

6. Артыкул 1 Закона Рэспублікі Беларусь ад 16 мая 2006 года «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у некаторыя заканадаўчыя акты Рэспублікі Беларусь па пытаннях ажыццяўлення фізічнымі асобамі рамеснай дзейнасці» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 78, 2/1207).

7. Закон Рэспублікі Беларусь ад 8 лістапада 2006 года «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 186, 2/1273).

8. Закон Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2007 года «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» (Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь, 01.11.2012., 2/1982).

15. Пастанова Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад 30 кастрычніка 1992 года «Аб увядзенні ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных дапамогах сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1992 г., № 27, ст. 474).

Артыкул 28. Пераходныя палажэнні

Да прывядзення актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Законам яны прымяняюцца ў той частцы, у якой не супярэчаць гэтаму Закону, калі іншае не вызначана Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь.

Дзяржаўныя дапамогі, прадугледжаныя артыкуламі 7, 10, 11, 18 і 19 гэтага Закона, права на якія ўзніклі да ўваходжання ў сілу гэтага Закона, прызначаюцца і выплачваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам, якое дзейнічала да ўваходжання ў сілу гэтага Закона.

Дзяржаўныя дапамогі, прадугледжаныя артыкуламі 12, 14, 16 і 17 гэтага Закона, права на якія ўзніклі да ўваходжання ў сілу гэтага Закона, прызначаюцца і выплачваюцца за перыяд па 31 снежня 2012 года ўключна ў адпаведнасці з заканадаўствам, якое дзейнічала да ўваходжання ў сілу гэтага Закона.

Выплата дзяржаўных дапамог, названых у частцы другой артыкула 4 гэтага Закона, ажыццяўляецца ў 2013 годзе за кошт сродкаў дзяржаўнага сацыяльнага страхавання.

Артыкул 29. Меры па рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона

Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у шасцімесячны тэрмін:

забяспечыць прывядзенне актаў заканадаўства ў адпаведнасць з гэтым Законам;

прыняць іншыя меры па рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

Артыкул 30. Уваходжанне ў сілу гэтага Закона

Гэта Закон уваходзіць у сілу з 1 студзеня 2013 года, за выключэннем гэтага артыкула і артыкула 29, якія ўваходзяць у сілу з дня афіцыйнага апублікавання гэтага Закона.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА

29 снежня 2012 года, г. Мінск.
№ 7—З

Тэкст з'яўляецца неафіцыйным перакладам Закона.

Афіцыйнае апублікаванне ажыццяўляецца ў афіцыйным перыядычным выданні «Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь».

■ Палітычны клуб «Звязды»

БЕЛАРУСЬ ПАМІЖ ЗАХАДАМ І УСХОДАМ

«Звязда» працягвае серыю экспертных сустрэч для абмену думкамі па найбольш спрэчных і актуальных тэмах палітычнай павесткі дня Беларусі. Сёння наша размова прысвечана супярэчнасцям і перспектывам інтэграцыйных працэсаў у Еўропе і на постсавецкай прасторы.

НАРАВІСТАЕ ДЗІЦЯ

Арсеній СІВІЦКІ, ***палітычны аналітык «Звязды»:***

— Нашу дыскусію я хацеў бы пачаць з правакацыйнага тэзіса, згодна з якім крызіс адносін паміж Еўрапейскім саюзам і Беларуссю абумоўлены не столькі непрызнаннем вынікаў прэзідэнцкіх выбараў з боку ЕС, колькі адсутнасцю выразнай стратэгіі Еўрапейскага саюза ў дачыненні да Беларусі. Мы сёння нецікавыя ЕС. Еўрасаюз знаходзіцца ў пошуку новай геапалітычнай ідэнтычнасці, ужо не еўраатлантычнай (калі дарога ў ЕС лажала праз ўступленне ў НАТА, а постсавецкая прастора разглядалася як арэна канкурэнцыі паміж Расіяй і Захадам), а ўласна еўрапейскай, што прадугледжвае і іншае разуменне Еўропы як «Вялікай Еўропы» ад Уладзівастока да Лісабона. У гэтай «Вялікай Еўропе» Беларусі складана канкурыраваць за стратэгічную ўвагу з боку ЕС з той жа Расіяй.

Юрый ШАЎЦОЎ, ***дырэктар Цэнтра еўрапейскай інтэграцыі:***



— У нас з Еўрапейскім саюзам ёсць дзве сістэмныя буйныя супярэчнасці, якія вызначаюць негатыўны фон адносін. Па-першае, шматгадовая, пачынаючы з 1994 года, палітыка Беларусі на ўсходзе, накіраваная на ўдзел у інтэграцыйных аб'яднаннях. Па-другое, мы парушаем правілы развіцця ўсходнееўрапейскіх дзяржаў. Усе яны развіваюцца ў кантэксце еўрапейскай постіндустрыяльнай мадэлі: адказ ад буйной прамысловасці, жорсткая ідэалагічная ломка (адрыў ад Расіі і дэсаветызацыя), усталяванне парламенцкай дэмакратыі і расшчэпленае, дэцэнтралізаванае кіраванне. Апошнім часам намецілася яшчэ некалькі тэндэнцый, на якія ў Беларусі і ЕС супрацьлеглыя погляды: актыўны ўдзел у вайсковых дзеяннях на тэрыторыі трэціх краін на баку ЗША і іх саюзнікаў і працоўная міграцыя.

Такім чынам, мы не ўпісваемся ў агульны стандарт развіцця Усходняй Еўропы і выклікаем каштоўнаснае непрыманне, раздражненне сваёй самастойнасцю, стылем сваёй палітыкі. Разам з тым, мы не ствараем ніякіх пагроз. Таму адносна Беларусі не вядзецца сістэматычнай працы, існуюць толькі тактычныя крокі, якія абумоўлены не мэтанакіраванай барацьбой супраць Беларусі, а фонам раздражнення.

Павел ВЕШТАРТ, ***старшыня праўлення сацыяльна-эканамічнага фонду «Ідэя»:***

Нават калі б гіпатэтычна мы пайшлі на ўсе патрабаванні ЕС, Беларусь у бліжэйшыя 20 — 25 гадоў наўрад ці змагла б уступіць у Еўрасаюз. Там зараз існуе шэраг унутраных праблем, спектр інтэрэсаў перараз мяркоўваецца на арабскі свет, Магрыб, Балканы. Таму цяпер дакладнай стратэгіі ў дачыненні да Беларусі няма.

АДМЫСЛОВЫ ФАРМАТ

А.С.: Сёння замест палымяных прамоў палітыкаў пра гатоўнасць прыняць Беларусь у ЕС, нам прапанаваны ўдзел у некалькіх еўрапейскіх знешнепалітычных ініцыятывах, у тым ліку ва «Усходнім партнёрстве», а з нядаўняга часу — у «Дыялогу для мадэрнізацыі». З майго пункту гледжання, гэта свайго роду суцяшальны прыз з боку ЕС для таго, каб неяк захаваць добрую міну пры дрэннай гульні.

Дзмітрый ЯРМАЛЮК, ***начальнік аддзела ЕС і субрэгіянальных арганізацый Упраўлення агульнаеўрапейскага супрацоўніцтва Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь:***

Спачатку наша краіна была адным з энтузіястаў «Усходняга партнёрства». У нас былі свае інтарэсы, якія адрозніваліся ад інтарэсаў іншых краін — суседзяў ЕС на постсавецкай прасторы. Мы разглядалі «Усходняе партнёрства» як рамкі для супрацоўніцтва, а не як механізм інтэграцыі з Еўрасаюзам. У сілу палітычных абмежаванняў ЕС для ўдзелу Беларусі быў адведзены толькі шматбаковы фармат (ЕС + уся група краін-удзельніц «Усходняга партнёрства»). Двухбаковы фармат (ЕС + краіна-ўдзельніца «Усходняга партнёрства») не быў прадугледжаны для нас.

Еўрапейскі саюз лічыць «Усходняе партнёрства» эфектыўным, бо падпісаны шэраг пагадненняў аб спрашчэнні візавых рэжымаў, падрыхтаваны пагадненні аб утварэнні зон свабоднага гандлю. Аднак усе гэтыя працэсы і фарматы паспяхова развіваліся б і без «Усходняга партнёрства». Па сутнасці, гэта — «лэйбл», які мала на што ўплывае.

Мы не атрымліваем у рамках «Усходняга партнёрства» шмат таго, што маюць нашы суседзі, але, удзельнічаючы ў ім, на сёння нічога і не губляем. У нас ёсць канал для дыялогу з ЕС, і мы яго выкарыстоўваем. Ёсць перавагі, ёсць і рызыкі. Апошнія перш за ўсё паходзяць ад дзейнасці Парламенцкай асамблеі Усходняга партнёрства «Еўранэст». Удзел Беларусі ў ім прыпынены з-за пазіцыі Еўрапейскага парламента, які аказваў моцны ціск на астатнія краіны-партнёры.

Наш далейшы ўдзел у гэтай ініцыятыве ў многім будзе залежаць ад таго, наколькі тэндэнцыя дыскрымінацыі Беларусі (якую прасоўвае нават не ЕС, а пэўныя асобы ў Еўрасаюзе, пэўныя краіны) працягнецца і, такім чынам, стане перашкодай для нашых інтарэсаў.

Што тычыцца «Дыялогу па мадэрнізацыі», не магу сказаць, як ён канкрэтна развіваецца, ці прывёў да пэўнага выніку, і ці разлічвалі яго ініцыятары на канкрэтны вынік. Пакуль пытанне застаецца ў тым, ці лічыць Еўрасаюз сябе адзінай сілай, якая можа мадэрнізаваць Беларусь, або ж усё-такі лічыць, што гэтая мадэрнізацыя павінна адбывацца ў форме раўнапраўнага дыялогу паміж тымі, хто вызначае курс мадэрнізацыі ўнутры краіны, і тымі, хто гатовы адкрыта спрыяць гэтаму працэсу з замежжа.

Беларусь ніколі не адмаўлялася ад дыялогу з ЕС па любых, нават вострых, балючых для яе тэмах. Галоўнае, каб гэты дыялог адбываўся ў нармальным цывілізаваным ключы, а не па схеме «пракурор — абвінавачаны». Таму калі Еўрасаюз сапраўды зацікаўлены ў мадэрнізацыі Беларусі, калі яго канцэпцыя мадэрнізацыі супадае з нашай, ці калі ён гатовы да выпрацоўкі адзінай з намі канцэпцыі мадэрнізацыі і калі ён прызнае ўлады Беларусі ў якасці раўнапраўнага партнёра ў гэтым дыялогу, то праблем няма.

А.С.: У 2009 годзе з боку Еўрасаюза была запушчана ініцыятыва ў дачыненні да Расіі «Партнёрства для мадэрнізацыі». Паміж гэтымі дзвюма ініцыятывамі каласальная розніца: калі беларускі «Дыялог» — гэта экспертныя вячоркі людзей, якія не маюць доступу да рэсурсаў і не валодаюць рычагамі ўплыву, то расійскае «Партнёрства» напоўнена канкрэтнымі эканамічнымі праектамі. Калі Еўрасаюз сапраўды зацікаўлены ў паўнавартаснай мадэрнізацыі Беларусі, то варта было б замяніць «Дыялог па мадэрнізацыі» аналагам «Партнёрства для мадэрнізацыі».

АДНОСІНЫ БЕЗ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ

А.С.: Многія эксперты ацэньваюць палітыку санкцый ЕС у дачыненні да Беларусі як неэфектыўную: тавараабарот паміж Еўрасаюзам і Беларуссю расце, з-за ўдзелу Беларусі ў Мытным саюзе санкцыі не наносяць ніякай шкоды нагогул. Але наяўнасць санкцый ускладняе працэс выбудоўвання дыялогу паміж Беларуссю і ЕС. Няўжо для Еўрасаюза важна «сімвалічна» падкрэсліць сваю пазіцыю, пры тым, што рэальна ўплываць на стан унутры краіны ён не можа? Або не заўсёды і жадае?

Ю.Ш.: Санкцыі не могуць быць эфектыўнымі, бо фарміруецца Мытны саюз, і ў той ці іншай ступені ў нас тыл забяспечаны. Да таго ж Беларусь, нарошчваючы пастаянна свой эканамічны патэнцыял, становіцца свайго роду лідарам, як мінімум для Літвы і Латвіі — краін, якія знаходзяцца побач і ў значнай ступені залежнасці ад Беларусі па некаторых эканамічных параметрах. Тое самае і для шэрагу рэгіёнаў Украіны і Польшчы, іншых краін. І чым больш Беларусь будзе нарошчваць свой эканамічны патэнцыял, тым больш вакол нас будзе ўзмацняцца аб'ектыўна існуючы пояс добрасуседства.

Д.Я.: У перспектыве рашэнне крызісу ёсць. Мы не разлічваем на той фармат інтэграцыі з ЕС, на які спадзяюцца іншыя краіны постсавецкай прасторы. Мы да гэтага і не імкнёмся. Але нават пры тых ідэалагічных супярэчнасцях, пра якія тут казаў калега, такі фармат супрацоўніцтва, які існуе паміж ЕС і любой іншай краінай, той жа Расіяй, рэальны. Аднак ЕС падыходзіць да Беларусі з тымі шаблонамі, што і да краін, якія ставяць перад сабой мэту ўваходжання ў ЕС.

У Еўрасаюза ёсць інтарэс да нас, у нас ёсць інтарэс да Еўрасаюза. Калі інтарэсы супадаюць, трэба супрацоўнічаць. Калі яны не супадаюць — ніякіх крыўдаў. Супрацоўніцтва не павінна тлумачыцца як плата за добрыя паводзіны. Гэта супярэчыць усёй логіцы міжнародных адносін. Ні адна краіна не супрацоўнічае з іншай толькі таму, што тая паводзіць сябе так, як падабаецца першай. Яны супрацоўнічаюць з-за сваіх прагматычных нацыянальных інтарэсаў. Так заўсёды было і застанецца.

ЕС прытрымліваецца такой перакручанай логікі, што любое супрацоўніцтва, любы дыялог — плата за паводзіны, якія павінны ўпісвацца ў пэўныя рамкі, прычым не толькі паводзіны на міжнароднай арэне, а, перш за ўсё, унутры краіны. Такое стаўленне, характэрнае ў дачыненні да краін-кандыдатаў на членства ў ЕС, цяпер пад іншым выглядам ужываецца да краін постсавецкай прасторы, Беларусі, у прыватнасці, якая пакуль не мае ніякай схільнасці да ўступлення ў Еўрасаюз.

Удзел у любым інтэграцыйным аб'яднанні звязаны з адмовай ад пэўнай долі суверэнітэту. Іншая справа, што краіны атрымліваюць ўзамен.

Наш стратэгічны інтарэс у дачыненні да ЕС — палягчэнне візавага рэжыму і лібералізацыя ўзаемнага гандлю ў той меры, у якой дазваляе стан нашай эканомікі і нашы абавязацельствы ў рамках іншых інтэграцыйных працэсаў, перш за ўсё ў рамках Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы.

Ю.Ш.: Мне здаецца, што ў бліжэйшы час з узмацненнем кіравальнасці «саюзнага цэнтра» ўнутры ЕС з-за крызісу павялічваецца рызыка паглыблення канфрантацыі з Беларуссю, але гэта не фатальныя рызыкі, таму што адначасова можна чакаць узмацнення геапалітычнага мыслення наўзамен ідэалістычнага разумення еўраінтэграцыі. Ёсць надзея, што мы ўпішамся ў іх геапалітычнае мысленне ў духу Realpolitik, так як рэальных пагроз не ўяўляем.

Пакуль у ЕС крызіс, пакуль не выстаялася новая вертыкаль, у нас ёсць шанцы ўзмацніць пазіцыі ў поясе добрасуседства, кропкі ўваходу ва ўнутрыпалітычную прастору ЕС. Нейкія кропкі судакранання ў нас ёсць — інфраструктурныя праекты, якіх раней не было, або яны былі не так відавочныя: арганізацыя чыгункі на Клайпеду, стварэння прывязанага да Беларусі другога порта Клайпеды. Падобных праектаў за 5—7 гадоў, пакуль ЕС выбіраецца з крызісу, можа хапіць для таго, каб мы маглі мець пазіцыі для выбудоўвання рацыянальных адносін з ЕС.

АБ «ІНТЭГРАЦЫІ ІНТЭГРАЦЫЙ»

Ю.Ш.: Еўразійскі саюз — не альтэрнатыўны полюс Еўропе. Расія — сыравінная дзяржава, прывязаная да рынкаў Еўрапейскага саюза. Як бы ні развівалася арыентацыя Расіі на Азію, стан залежнасці ад Еўропы застанецца назаўсёды. Бо Расія, на мой асабісты погляд, гэта буйная перыферыйная дзяржава, якая адносіцца да еўрапейскай цывілізацыі, спецыфічная, але еўрапейская. Таму глыбінная сувязь паміж Расіяй і Еўропай надоўга.

Еўразійскі інтэграцыйны працэс — гэта фарміраванне рэгіянальнай групоўкі ў сітуацыі ўнутранага фінансавага крызісу Еўрасаюза. Мытны саюз не адрывае нас ад ЕС, а стварае больш моцную канкурэнтную пазіцыю на еўрапейскім рынку і на еўраатлантычнай прасторы. Гэта, мне здаецца, тая дадатковая кропка апоры для Беларусі, якая павінна прывесці да нармалізацыі адносін з ЕС. Еўразійскі саюз дае нам тыл для таго, каб тая авантурніцкая «гуманітарная» карпарацыя, якая склалася для барацьбы з нашым рэжымам, пры сутыкненні з больш сістэмнымі гульцамі адступала. Так выйшла з санкцыямі.

А.С.: Тая геапалітычная рэальнасць, з якой мы сёння сутыкаемся, патрабуе новых тыпаў геапалітычнага мыслення. Асноўны вектар дзвюх інтэграцый накіраваны на фарміраванне агульнай архітэктуры бяспекі ад Уладзівастока да Лісабона і на стварэнне агульнага рынку на гэтай прасторы. Беларусь павінна ўбудоўвацца ў гэтыя доўгатэрміновыя трэнды і аптымізоўваць свае адносіны з ЕС і з іншымі дзяржавамі, больш эфектыўна дзейнічаць у рамках Мытнага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы, будучага Еўразійскага эканамічнага саюза.

П.В. З расійскімі калегамі нам прасцей весці дыялог з-за больш блізкага менталітэту. Трэба канстатаваць, што ў Расіі менеджмент больш еўрапейскі, заканадаўства больш блізкае да еўрапейскага, больш актыўныя кантакты паміж дзяржавамі і органамі ўлады ЕС, адбываецца супрацоўніцтва ў ваеннай сферы (згадайце базу НАТА ва Ульянаўску).

Таму ўступленне Беларусі ў Еўразійскі саюз дазволіць наблізіць Беларусь да еўрапейскіх стандартаў, пры гэтым атрымаць тыл, які дазволіць размаўляць з Еўрасаюзам на роўных. Узаемны працэс інтэграцыі ЕС і Еўразійскага саюза будзе ўзмацняцца, таму што спектр агульных інтарэсаў у сферы эканомікі і бяспекі даволі вялікі. У хуткім часе мы зблізім наша заканадаўства з еўразійскім, у той жа час еўразійскае заканадаўства будзе збліжацца з еўрапейскім. І можа быць, праз гэтыя працэсы мы выйдзем на новы ўзровень партнёрства з ЕС.

Д.Я.: Справядліва, што членства ў шырокай інтэграцыйнай групе, важкай у эканамічным і палітычным плане, павялічвае аўтарытэт Беларусі. Калі мы ўсё ж такі імкнёмся да больш цесных сувязяў з Еўропай, вопыт іншых краін паказвае, што ў Еўропу трэба прыходзіць моцнымі: адна справа, што Беларусь у дыялогу з ЕС гаворыць толькі ад свайго імя і адказвае толькі за сябе, іншая справа, калі Беларусь выступае адным з трох «акцыянераў» буйнога інтэграцыйнага аб'яднання, рэальна ўплываючы на працэсы, якія адбываюцца на прасторы ад Брэста да Уладзівастока і да кітайскай мяжы.

Для нас «інтэграцыя інтэграцый» — варыяцыі на тэму шматвектарнай палітыкі. Іншыя краіны постсавецкай прасторы ўжо пачынаюць разумець, што будучыня эканамічнай бяспекі нашых краін і ўвогуле гандлёва-эканамічных сувязяў у Еўропе будзе вызначацца ў значнай ступені ўзаемаадносінамі паміж двума інтэграцыйнымі блокамі — ЕС і Еўразійскім эканамічным саюзам.

Сённяшняя сітуацыя паказвае, што ЕС не цалкам схіляецца да таго, каб дапусціць краіны постсавецкай прасторы ў кола дзяржаў-членаў, таму Мытны саюз можа стаць альтэрнатывай для гэтых краін. Мытны саюз у будучыні бачыцца не толькі як інструмент, механізм для прасоўвання інтарэсаў тройкі Беларусі, Расіі і Казахстана, але і патэнцыйная кропка прыцягнення для тых краін, якія пакуль застаюцца за рамкамі аб'яднання.

Мытны саюз можа рэальна змяніць геапалітычны расклад на кантыненце. Гэта ў многім залежыць ад таго, якіх поспехаў у фармаце тройкі мы дасягнем у агульным інтэграцыйным працэсе, наколькі станем прывабнымі, наколькі іншыя краіны зразумеюць, што гэты блок, гэта аб'яднанне на самой справе здольнае абараніць іх інтарэсы і зрабіць іх больш моцнымі.

Супрацоўніцтва не павінна тлумачыцца як плата за добрыя паводзіны. Гэта супярэчыць усёй логіцы міжнародных адносін.

Ю.Ш.: Дзякуючы Мытнаму саюзу стала магчыма рэалізацыя беспрэцэдэнтнага для Беларусі праекта Беларуска-кітайскага індустрыяльнага парку з інвестыцыямі на ўзроўні 30 млрд долараў. Размяшчэнне менавіта ў нас гэтага тэхнапарку паказвае накіраванасць будучых таварных патокаў: яны будуць накіраваны не толькі на Мытны саюз, а ў вельмі значнай ступені — на еўрапейскі рынак. Гэты праект — яшчэ і ўцягванне ў Беларусь Кітая з усімі яго магчымасцямі ў знешняй палітыцы, дыпламатыі і эканоміцы. Такія маштабныя праекты і ёсць увасабленне «інтэграцыі інтэграцый».

«Звязда»: *Наколькі інтэграцыйныя працэсы на еўразійскай прасторы пагражаюць суверэнітэту кожнай з краін?*

Д.Я.: Удзел у любым інтэграцыйным аб'яднанні звязаны з адмовай ад пэўнай долі суверэнітэту. Мы пайшлі на тое, каб паступіцца з наш

■ На свае вочы

ПРАЗ ЧВЭРЦЬ СТАГОДДЗЯ ТУТ БУДЗЕ ВОЗЕРА

Хто не бачыў шматступеньчатага кар'ера ў Мікашэвічах, таму ўявіць гэтыя палескія скалы будзе нялёгка. Камень здабываецца этапамі, раздробленыя тэхнікай участкі ўтвараюць магутныя прыступкі па перыметры, якія тут называюць гарызонтамі. Амаль з кожнага гарызонту прабіваюцца грунтовыя воды, якія дзе-нідзе ўтвараюць сапраўдныя вадаспады. Глыбіня кар'ера дасягае 130 метраў.

— Гадоў праз 25-30 тут будзе возера, па глыбіні параўнальнае хіба што з Байкалам, — гаворыць наш экскурсавод — начальнік вытворчасці драбільна-сартавальнага завода Сяргей Міхайлаў. — А яшчэ вельмі чыстае, бо дно каменнае.

Такога возера, якім некалі стане мікашэвіцкі кар'ер, дакладна няма ў Беларусі. А пакуль тут месціцца адно з буйнейшых у Еўропе горназдабывальных і перапрацоўчых прадпрыемстваў па вытворчасці будматэрыялаў. Яно працуе ў палескай глыбінцы з 1975 года. Бо яшчэ ў 1960-х гадах геолагі знайшлі вялікае радовішча прыроднага каменю — з-пад зямлі ўздымаліся скалы, пакрытыя невялікім слоем пяску. Тады і было прынята рашэнне ўзвесці каля пасёлка Мікашэвічы Лунінецкага раёна камбінат нярудных матэрыялаў.

«Граніт» сёння — не толькі шматфункцыянальны тэхналагічны комплекс. Гэта горадаўтваральнае прадпрыемства Лунінецкага раёна. А для 13-тысячнага горада Мікашэвічы «Граніт» — гэта ўсё. Тут працуюць тры тысячы чалавек. Значыць, амаль кожная сям'я нейкім чынам мае дачыненне да прадпрыемства і зацікаўлена ў яго стабільнай рабоце. Зацікаўлена і дзяржава. Бо 80% нярудных матэрыялаў для будаўнічага комплексу рэспублікі выпускаецца ў Мікашэвічах.

У кар'еры «Граніта».

Шчэбень патрэбны ў нашай краіне, яго ахвотна бяруць і замежныя партнёры. Таму зразумела, што папярэдняе дзесяцігоддзе прадпрыемства паэтапна ажыццяўляла праект пашырэння вытворчасці і ўсебаковай мадэрнізацыі. Аб завяршэнні рэканструкцыі на «Граніце» адрапартавалі ў 2008 годзе. Але калі вынікі ажыццяўлення праекта рэканструкцыі праверыў Дзяржкантроль, было выяўлена надта многа вытворчых хібаў, а таксама фактаў марнатраўства. Дарагое фінскае абсталяванне не працавала як след, часта выходзіла са строю. А, напрыклад, улік і кантроль здабытага шчэбеню вёўся наогул прыблізна. Сядзела дзяўчына і запісвала ў сшытак: поўная машына — адну лічбу ставіла, крыху няпоўная — другую. Цяпер справа арганізавана па-іншаму. Дакладны ўлік здабытага каменю вядзе тэхніка і электроніка.

Па выніках праверкі праведзена калегія Камітэта дзяржкантролю, дзе падрабязна аналізавалі ўсе недахопы. Былы кіраўнік прадпрыемства «Граніт» вызвалены ад сваёй пасады. У 2011 годзе старшыня Камітэта дзяржкантролю краіны Аляксандр Якабсон правёў нараду на прадпрыемстве. Тэмай яе стала рэалізацыя інвестыцыйнага праекта па будаўніцтве пятай тэхналагічнай лініі па вытворчасці нярудных матэрыялаў.

Гэтую лінію не без гонару за сваё прадпрыемства нам паказалі Сяргей Міхайлаў і яго калегі. Яе ўклад у агульны аб'ём вытворчасці, які ў мінулым годзе дасягнуў амаль 13,5 мільёна тон шчэбеню, склаў больш за 700 тысяч тон. А з выхадам на праектную магутнасць сёлета гэты паказчык дасягне трох мільёнаў тон. Такім чынам

Сёння прадпрыемства не можа задаволіць попыт замежных партнёраў. Нават першапачаткова дазволеныя 10% выраблянай прадукцыі пакуль не ўдаецца паставіць на экспарт, бо трэба насычаць спачатку свой унутраны рынак.

«Граніт» наблізіцца да вытворчасці 16 мільёнаў тон будматэрыялаў за год. Для параўнання: у 2008 годзе было толькі 10 мільёнаў.

Цікава, што ўсе гэтыя лічбы з ходу называе начальнік упраўлення Камітэта дзяржкантролю Брэсцкай вобласці Вячаслаў Бычкоўскі. Паводле яго слоў, спецыялісты камітэта, якія некалькі гадоў працуюць з «Гранітам», разам з працаўнікамі «хварэюць» за яго поспех, за выкананне вытворчых паказчыкаў.

Зараз на парадку дня — асваенне новага радовішча «Сітніцкае». Як ужо гаварылася, прыкладна праз чвэрць стагоддзя мікашэвіцкі кар'ер стане возерам, а патрэба ў будаўнічых матэрыялах не адпадзе. За два дзясяткі кіламетраў ад цяперашніх каменных скал знойдзены новыя. Там і павінен вырасці новы горна-абагачальны камбінат. Галоўны інжынер «Граніта» Валерый Батура гаворыць, што асваенне «Сітніцкага» ўключана ў дзяржаўную праграму развіцця Прыпяцкага Палесся. Зараз вядуцца праектныя работы па распрацоўцы кар'ера. А ў 2015 годзе тут павінен прыступіць да работы і новы завод.

Пакупнікі на прадукцыю знойдуцца. Будматэрыялы ахвотна бяруць у Расію, Прыбалтыку. Але сёння прадпрыемства не можа задаволіць попыт замежных партнёраў. Нават першапачаткова дазволеныя 10% выраблена прадукцыі пакуль не ўдаецца паставіць на экспарт, бо трэба насычаць спачатку свой унутраны рынак.

...З кар'ера ўвесь час узнімаюцца магутныя БелАЗы, кожны з якіх вязе да 60 тон пароды. На здабычы каменю працуюць магутныя экскаватары, такія, як ЭКГ-10 — самы сучасны на постсавецкай прасторы. Работа ў працаўнікоў прадпрыемства нялёгкая. Таму зразумела, што тут створана вельмі добрая сацыяльная інфраструктура для падтрымкі здароўя: ёсць свой санаторый, фізкультурна-аздараўленчы комплекс, басейн. У аўтобусе, на якім мы спускаліся ў кар'ер, давялося міжволі падслухаць размову двух спецыялістаў сярэдняга персаналу:

— Не чуў, з новага года квіткі ў басейн не падаражэлі?

— Ды не. Усё засталося, як было.

Значыць, басейн запатрабаваны, як і іншыя падобныя аб'екты. Імі карыстаюцца не толькі працаўнікі, але і ўсе ахвотныя жыхары маленькіх Мікашэвічаў. Дарэчы, у канцы снежня калектыў «Граніта» зрабіў асаблівы навагодні падарунак роднаму гораду. Яго ўпершыню ўпрыгожылі разнастайнай святочнай ілюмінацыяй. Каб зарабіць сродкі на гэта, працаўнікі нават праводзілі суботнік. Затое Мікашэвічы ў калядныя дні нагадалі ўтульны еўрапейскі гарадок.

Святлана ЯСКЕВІЧ

■ Светагляд

МІФЫ АДНАГО АЎТАРА

Рэцэпт ад песімізму: Нераток — Юлаў — Гарбачоў...

Далёка не заўсёды паміж чалавекам і асобай можна паставіць знак роўнасці. Асобай трэба стаць, а не нарадзіцца. Часам на яе станаўленне не хапае і цэлага жыцця. А бывае, што ёю становяцца неаднойчы.
Знаёмцеся! Адзін чалавек — тры асобы, не падобныя адна на адну, але вядомыя ў сваім коле.

Юрась НЕРАТОК — аўтар кніг вершаў «Фотаальбом» (2003 г.) і «Споведзь струны» (2011 г.), кнігі фантастычнай прозы «Закуцце» (2007 г.), укладальнік літаратурна-мастацкага выдання «Рэцэпт ад песімізму» (2012 г.), выдадзеных па-беларуску.

Юрый ЮЛАЎ — пісьменнік, які піша па-руску. Аўтар шматлікіх аповесцяў і серыі прозы «МІФ» (Мужчынская інтэлектуальная фантазія), выдадзенай у 2012 годзе. Убачылі свет ужо чатыры кнігі серыі: «Мутант», «Фермер», «Тэрапія», «Па даразе на пікнік».

Юрый ГАРБАЧОЎ — галоўны канструктар вытворчага аб'яднання «ГРАДИС». Сярод яго распрацовак: выпрабавальныя цэнтрыфугі, атракцыёны, малыя архітэктурныя формы (вулічнае гульнявое, гаспадарчае і спартыўнае абсталяванне). Адзін з канструктараў знакавых для сталіцы аб'ектаў — Нацыянальнай бібліятэкі, Цэнтральнага чыгуначнага вакзала, гімнастычнай «вазы». За амаль тры дзесяцігоддзі яго наробак — больш за 450 канструктарскіх распрацовак!

І мала хто ведае, што Юрась Нераток і Юрый Юлаў — творчыя псеўданімы Юрыя Гарбачова, які нарадзіўся на Гродзеншчыне ў сям'і філолагаў, а зараз жыве, працуе і займаецца творчасцю ў Мінску.

Далёка не заўсёды паміж чалавекам і асобай можна паставіць знак роўнасці. Асобай трэба стаць, а не нарадзіцца. Часам на яе станаўленне не хапае і цэлага жыцця. А бывае, што ёю становяцца неаднойчы.
Знаёмцеся! Адзін чалавек — тры асобы, не падобныя адна на адну, але вядомыя ў сваім коле.

— У вас сімвалічны псеўданім — Нераток. У чым яго сэнс? І чаму творы, напісаныя па-руску, падпісваеце інакш — Юрый Юлаў? І калі ў канструктару нарадзіўся пісьменнік Юрый Юлаў і Юрась Нераток?

— Пэўна, маеце на ўвазе рыбалоўную снасць — нерат? Ды не, тады так і назваўся б! А яшчэ лепш «Каэф» — кітабойная флатылія. Нераткі — вясковая мянушка адной з радаводчых ліній маёй мамы, выкладчыцы беларускай мовы і літаратуры. Нераткі вызначаліся самастойнасцю і арыгінальнасцю мыслення, дасціпным гумарам. І да гэтага — добрае валоданне рамяством. Усе яны зніклі ў нябыт у часы рэпрэсій. А мяне, малога, часам называлі Нератком, калі казаў нешта трапнае або гумарное дарослым. Юлаў — ад прабабкі майго бацькі, выкладчыка рускай мовы і літаратуры. Зразумела, што ў часы перабудовы прозвішча Гарбачоў мела пэўныя асацыяцыі — не хацелася атрымліваць незаслужаныя бонусы або штрафы. Да таго ж бацькі размаўлялі між сабой кожны на сваёй (амаль літаратурнай!) мове. Таму, як і ў дзяцінстве, творчасць падзялілася на два псеўданімы. Так і жыву, як «Шцірліц-Ісаеў-Ціханаў».

— Верагодна, ад мовы залежыць і тое, што пішаце? Перавагу ў паэзіі аддаяце беларускаму слову, у прозе — рускаму?

— Вершы на рускай мове, якія павінен быў напісаць, напісаў. Ды і на беларускай мове Нераток апошнім часам, хутчэй, «сцябаецца і грашыць», чым піша вершы. Гэта нармальнае ўзроставае рашэнне, калі паставіцца да з'явы творчасці без эпігонства і адчаю. Перавага рускаму слову ў прозе ў адным — традыцыйная звужанасць, асцярожны кансерватызм беларускай тэматыкі. Нават пры сённяшнім пашырэнні сюжэтных межаў.

У час вызваліць пэўную творчую прастору — справа гонару любога творцы: выкапаў уласны ўраджай — не лезь на соткі суседзяў, з'еў свой кавалак торта — пакінь тым, хто чаўпецца каля стала.

— Як атрымалася, што тэхнар па адукацыі піша вершы і складае прозу? Па прафесіі вы — канструктар, у творчасці — фантаст. Дзе паралелі?

— Тэхнаром з'яўляюся не толькі па адукацыі і прафесіі, але і па азначанасці — як да сябе, так і да навакольнага свету. Калі да бацькоў дадаць старэйшага брата-філолага, дзядзьку па бацькавай лініі і цётку па матчынай, якія таксама выкладалі мову і літаратуру, то атрымліваецца як у той вядомай рускай прымаўцы: «В семье не без...» А спалучэнне аналізу і азарэння дае рашэнне задач любой складанасці: і на рабоце, і ў творчасці, і ў быце. Маюцца на ўвазе менавіта «задачы», а не праблемы і накананасці. Да таго ж прафесія канструктара — таксама творчая. І абмежаванняў там не больш, чым у любой другой творчасці. Гэта паралелі, якія перасякаюцца ў тым, што ўсе пазітыўныя віды дзейнасці чалавека для людзей і робяцца.

— Зборнік «Закуцце» — ваш дэбют? Як меркавалі ўвайсці ў беларускую літаратуру і як атрымалася? Фармальна дэбютавалі вы ў 2007 годзе, адносна нядаўна. А ўжо член Саюза пісьменнікаў Беларусі і Саюза расійскіх пісьменнікаў...

— «Закуцце» выдавалася ў серыі «Дэбют». Гэта сапраўды мая першая кніга прозы на беларускай мове. У той час у «Полымі» з'явіўся артыкул вядомага літаратурнага крытыка Лады Алейнік «Майстар-клас дэбютанта». У двукоссе было ўзята першае слова назвы, хоць прасілася наступнае. А найменне серыі можа і не адпавядаць асобе аўтара. Калі скажам, «Залатое пяро», дык аўтары звычайнымі сродкамі твораў і не пісалі, толькі залатымі пер'мі?

Рэальна дэбютаваў у беларускай літаратуры ў 1997 годзе «ЛіМ»аўскай нізкай вершаў з уступным словам сённяшняга патрыярха айчыннай літаратуры Уладзіміра Казберука. У Саюз расійскіх пісьменнікаў уступіў з некалькімі кніжкамі ў 2002 годзе (бацька яшчэ паспеў пабачыць пасведчанне і ўстаноўчыя дакументы , якія даслалі па пошце). У беларускі — у 2005-м, а ў Міжнародны Саюз пісьменнікаў «Новый Современник» — у 2011-м.

Фіксацыя творчага росту адбываецца эвалюцыйна: выконваюцца прапісаныя патрабаванні, адбываюцца пэўныя працэдуры разгляду і вынясення рашэнняў... Планаў наконт творчай кар'еры ніколі не рабіў: бачыў, што «планка ўзята» (лепш — пераўзята), і прыносіў здабыткі на суд тых, хто атабарыўся раней і вырашае лёс арганізацыі.

— Адна з вашых тэм — містыка. Вы бачыце тое, чаго не бачым мы?

— Ніякай містыкі. Гэта толькі здаецца, што няма таго, пра што напісаў.

— Якія адносіны маеце да медыцыны? Здаецца, што верш «Хірург» напісаў медык...

— У дзяцінстве хварэў на вятранку... Добра, што вам не трапіў на вока верш «Дзядзька-філосаф»! ...Калі сур'ёзна, пісьменнікі павінны разумець іншых людзей, а досвед набываць дакладна і хутка.

— У сваіх творах вы запрашаеце да роздуму над спрадвечнымі пытаннямі, якія ва ўсе часы хвалявалі чалавецтва. Ці актуальна гэта сёння?

— Пытанні, якія хвалююць чалавецтва, мала хвалююць канкрэтнага чалавека. Таму агульначалавечыя пытанні заўсёды актуальныя.

— Хто ваш чытач?

— Падобнае пытанне — гібель для любога аўтара... Каб неяк выкруціцца, яго трактую «На якога чытача арыентуецеся?» З інтэлектам вышэй за сярэдні, з уласнымі думкамі, з творчымі ўласцівасцямі.

— Вы — заўсёднік творчых вечароў, розных імпрэз. У пэўным коле вас ведаюць як барда. Чым Нераток-бард адрозніваецца ад Нераткапісьменніка?

— Заўсёднік — занадта гучна: час ад часу выступаю — праўдзівей. Чалавек не сцэнічны, але публічны — так дакладней. Пісьменнік занурана піша, зрэдку задаволена выдыхае: «Удалося!» А мажорны бард у чырвонай бандане спявае вершы, напісаныя Нератком.

— Аднойчы вы сказалі: «Нашто пісаць вершы, калі не толькі чалавечая цывілізацыя крохкая, але і Зямля не вечная? Адказу няма і не будзе...» А нашто пішаце вершы вы? Паспрабуйце адказаць.

— Калі ў вершы не адказаў, то і цяпер не спраўлюся...

— Ці канфліктуюць або супернічаюць між сабой творцы Нераток і Юлаў?

— Наадварот, дапамагаюць, хаўрусуюць, дзеляць поспех.

— А Гарбачоў?

— А Гарбачоў на іх працуе, хоць часам дысцыплінуе і патрабуе справаздачы...

— Апошняе з выдадзенага — чатырохтомнік сюжэтнай прозы «МІФ». Серыя «МІФ» (Мужчынская інтэлектуальная Фантазія). Што стаіць за гэтымі словамі? Аповесці ў серыі «МІФ» зусім розныя... Што іх аб'ядноўвае ў адну кнігу, у адну серыю?

— За абрэвіятурай «МІФ» стаіць яе расшыфроўка — мужчынская інтэлектуальная фантазія. І больш нічога. У нас не ўсе мужчыны, не ўсе інтэлектуальна мысляць, не ўсе фантазіруюць: і з сямі мільярдаў чалавецтва адразу застаецца сто мільёнаў — менш за дзве сотыя працэнта. Да слова, пажартаваў неяк у адносінах да калегі: «Ты адзін з тысячы. Вас у Мінску — дзве тысячы». Куды падзенешся ад глабальнасці! Тое, што аповесці розныя, сціплая аўтарская асоба ўспрымае кампліментам, а аб'ядноўвае іх той самы сціплы аўтар.

— Кожная аповесць мае падзагаловак: фантазія паганская, экалагічная, камп'ютарная, рамантычная... Вас можна нават назваць аўтарам класіфікацыі фантазіі! Па якім прынцыпе яе класіфікуеце? Ці будзе мець працяг серыя «МІФ»?

— «Для ўсіх адпаведных прыметнікаў мала слоўнікаў будзе і сметнікаў»... Можна сказаць, што фантазія — жанр, які я запусціў. Гэта не фантастыка, не фэнтэзі. Спрабую камбінацыямі не выйсці за фармат успрымальнасці. Працяг? Звычайна праекты дабіваю адразу. Дарэчы, брэнд серыі «МІФ» належыць выдаўцу Аляксею Вараксіну.

— Графіка ў кнігах «МІФ» — чыя фантазія?

— Мастакі (няхай не крыўдзяцца!) практычна не здольныя глыбока ўчытвацца ў тэксты, як і пісьменнікі не могуць хаця б чвэрць гадзіны глядзець на адзін і той жа фрагмент карціны, як паэты (калі яны не барды) не чуюць нюансаў чароўных гукаў піяніна.

Сваё разуменне фантазій даў у графіцы мінскі мастак Аляксандр Ліхачоў, чалавек, які малюе выдатныя і выразныя каляровыя палотны. А наконт сюжэтаў — нешта ў мяне сфармавалася, штосьці — у яго. Усё роўна грэчаскае «mousai», апроч думкі (мыслі), нічога не азначае.

— Некалькі экспрэс-пытанняў з кароткімі адказамі?

— Паспрабуем...

— Ці ёсць пэўны баланс паміж творчасцю і работай? Чаму аддаяце перавагу?

— Імкненне да раўнавагі — закон Сусвету. Таму стараюся выраўняць Нераткa і Юлава між сабой, а творчасць — з работай.

— Вашае ўяўленне аб ідэальным грамадстве?

— Прыгожыя жанчыны, магутныя мужчыны, велізарная плошча для цывілізацыі.

— Вы жартуеце?

— Безумоўна. Чалавек не вольны выбіраць час і нават прастору.

— Што хацелі б пажадаць чытачам «Звязды»?

— Не баяцца нічога, а больш і лепш працаваць — усё атрымаецца!

Гутарыла Вераніка КАНЮТА

НА КАЛЯДЫ «ЦАРАМ» У КОЖНАЙ ХАЦЕ РАДЫ!

З кожным годам народны абрад «Калядныя цары», што праходзіць у вёсцы Семежава Капыльскага раёна, прыцягвае ўвагу не толькі беларусаў, але і замежных гасцей.

Увечары сем стройных кавалераў-салдат з урачыстым маршам, з запаленымі факеламі, у суправаджэнні барабаннага бою і вясёлага натоўпу ходзяць ад хаты да хаты. Кавалеры апрануты «з іголачкі»: белыя касцюмы, бліскучыя боты, нагрудныя крыжы. Чырвоныя семежаўскія паясы з геаметрычным арнаментам крыж-накрыж павязаны на грудзях кожнага «цара», на галаве — высокія шапкі з рознакаляровымі папяровымі стужкамі. Працэсія «цароў» на Шчодры вечар наведвае дамы вяскоўцаў і разыгрывае драму «Цар Максіміліян». Тут, у хатах, праходзіць сустрэча цароў, сварка, бойка. Прадстаўленні насычаныя народным гумарам, вясёлай бутафорыяй. Заканчваецца візіт «цароў» і іх світы (а гэта «лекар» з велізарнымі атрыбутамі сваёй прафесіі, «дзед» (пераапранутая ў мужчынскае рыззё дзяўчына), «баба» — размаляваны хлопец у жаночым уборы) вясёлымі песнямі, танцамі, добрымі пажаданнямі. З надыходам цемры «цары» запальваюць факелы, а пасля разам з усімі ўдзельнікамі святочнага шэсця багата частуюцца: гаспадары шчодра дзякуюць хлопцам за вясёлае віншаванне традыцыйнымі кулінарнымі дарамі — вясковай каўбаскай з печы, пірагамі, іншымі прысмакамі.

Абрад «Калядныя цары» — адзіны ў Беларусі, што ўваходзіць у Спіс нематэрыяльнай спадчыны ЮНЕСКА.

Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.

в. Семежава, Капыльскі раён.

Віншую з днём нараджэння
Рыгора Адамавіча ЛУГОЎСКАГА.
Жадаю здароўя, шчасця, утульнасці ў доме і цеплыні, ад Бога — здароўя, ад людзей — дабрыні.
Мама.

■ І так бывае

«СТРЭЛІЛА» ДЗЕДАВА РУЖЖО

Жыхара Дзятлаўскага раёна затрымалі з незарэгістраванай стрэльбай падчас незаконнага палявання на дзіка.

— Увечары работнікі Слонімскай міжрайінспекцыі на тэрыторыі Дзятлаўскага лясгаса затрымалі жыхара вёскі Вензавец, які з незарэгістраванай аднаствольнай паляўнічай стрэльбы з прыцэлам начнога бачання незаконна здабыў дзіка. Парушальнік ужо цягнуў здабычу з лесу да дарогі, калі яго спынілі дзяржінспектары, — паведаміла прэс-сакратар Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслінnага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Вольга Грамовіч. — Затрыманы аказаўся паляўнічым з 27-гадовым стажам і ўладальнікам дзвюх зарэгістраваных паляўнічых стрэльбаў.

Паводле яго слоў, нелегальную зброю ён знайшоў у доме свайго дзеда, пасля чаго перахаваў у лесе. Што прымусіла вопытнага паляўнічага пайсці на парушэнне адразу некалькіх артыкулаў закона — зараз высвятляе следства. За незаконную здабычу дзіка браканьеру пагражае да трох гадоў пазбаўлення волі.

Штраф за выкарыстанне незарэгістраванай стрэльбы можа скласці ад 1 да 5 мільёнаў рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В РЕСПУБЛИКАНСКОЙ СОБСТВЕННОСТИ

Организатор аукциона: фонд «Минскоблгосимущество», г. Минск, ул. Чкалова, 5, тел.: (8017) 228-60-13, 224-39-76, 500-47-10

Место проведения аукциона: г. Минск, ул. Чкалова, 5

Дата и время проведения аукциона: 14 февраля 2013 г. в 11.00

Лот № 1

